ІЛЬВЯНЯ Ў ГРОДЗЕНСКАЙ КВАТЭРЫ 3

КАЛІ АДКРЫВАЮЦЦА ТАЛЕНТЫ 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ЛІСТАПАДА 2020 г. АЎТОРАК № 219 (29333)

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:

«Ужо ў 2020 годзе мы павінны выйсці на 400 электразарадных станцый у цэлым па краіне, да канца 2021 года будзе ўстаноўлена больш за 600 электразарадных станцый. Калі летась электрамабілі ў цэлым у краіне спажылі 2 млн кВт·гадз., то ў 2020 годзе будзе значнае павелічэнне. Прагназуюцца лічбы да 12 млн кВт·гадз.».

КАРАТКА

• Штотыдзень сацработнікі і валанцёры выконваюць каля 570 заявак адзінокіх пажылых грамадзян і інвалідаў на дастаўку прадуктаў харчавання і лекаў ва ўмовах COVID-19.

• **Рэйсы па маршруце Пекін — Мінск — Пекін прыпыненыя з 9 лістапада на тыдзень.**

• Дзіцячыя садкі і школы ў наступным годзе плануюць пабудаваць у Фаніпалі і Стоўбцах.

• **Хуткасныя цягнікі «Ластаўка» могуць з'явіцца на маршруце Масква — Мінск пасля зняцця абмежаванняў на пасажырскія чыгуначныя зносіны, уведзеныя з-за пандэміі каранавіруснай інфекцыі.**

• У Мінску аб'яўлены конкурс эскізаў навагодніх цацак для галоўнай ёлкі сталіцы.

• **Электронны кірмаш вакансій пройдзе 12 лістапада з удзелам васьмі арганізацый Мінска.**

Птушкі на кружэлках

Жыхарка вёскі Меркулавічы Чачэрскага раёна Галіна ГАЗЕНКА — асоба творчая. Па адукацыі яна будаўнік, а па прызванні — мастак і разьбяр, дваццаць гадоў працуе метадыстам у сельскім Доме культуры, вядзе гурткі, вучыць дзяцей маляванню, займаецца рэльефнай разьбой, любіць роспіс па дрэве. Нядаўна Галіна Іванаўна распісала старыя і непатрэбныя грампласцінкі і стварыла на іх незвычайную калекцыю маляваных нацюрмортаў і пейзажаў. А серыя птушак, якую яна працягвае маляваць, выклікае вялікі інтарэс сярод наведвальнікаў і гледачоў пастаяннай выстаўкі ў фае вясковага клуба.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Размова па сутнасці

Важна не страціць давер людзей

Актыўнасць грамадства ў абмеркаванні неабходных змен, якіх патрабуе развіццё нашай дзяржавы, павінна быць выкарыстаная для ўдасканалення як Асноўнага Закона, так і заканадаўства ў цэлым

Да гэтай высновы прыйшлі ўдзельнікі своеасаблівай дыялогавай пляцоўкі, што ў фармаце круглага стала адбылася ў сценах рэдакцыі газеты «Звязда». У размове ўзялі удзел дэпутат Палаты прадстаўнікоў Віктар СВІЛА, член Савета Рэспублікі Віктар ЧАЙЧЫЦ, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ала ШАЎЦОВА і галоўны ўрач 1-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Дзмітрый ШАЎЦОЎ.

Фота БелТА.

«МЫ ЎЖО ПРАЙШЛІ ЭТАП, КАЛІ НАМ БЫЛА ПАТРЭБНА МОЦНАЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ ЎЛАДА»

«Звязда»: Чаму ў Беларусі ўзнікла патрэба перачытаць Канстытуцыю, задумацца пра яе трансфармацыю? І калі такая патрэба ўзнікла?

Віктар Чайчыц: На мой погляд, вельмі важнае пытанне — «Калі?». Зараз усе пра гэта кажуць, больш за тое, асобныя людзі лічаць, што гэта звязана з наступствамі сёлетніх выбараў. Але і інтэрнэт, і дзяржаўныя СМІ сведчаць: пра тое, што наспела неабходнасць змянення Канстытуцыі, Прэзідэнт казаў амаль два гады таму.

СТАР. 4–5

На слыху

«Гэты год вельмі цяжкі для сістэмы аховы здароўя»

Паводле даных Міністэрства аховы здароўя, школьнікі складаюць 8-12 % сярод захварэлых на COVID-19. Нягледзячы на такую невялікую лічбу, а таксама той факт, што дзеці і падлеткі пераносяць гэту інфекцыю лягчэй, чым дарослыя, у школах прымаюцца пэўныя меры па папярэджанні захворвання. Пра арганізацыю навучальнага працэсу ва ўмовах распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі, а таксама пра асаблівасці другой хвалі мы распыталі спецыялістаў — загадчыка аддзела эпідэміялогіі Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анжэлу ГАЛЕНЧЫК і загадчыка аддзела гігіены Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кацярыну СУХАВЕР.

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

РАШЭННІ ДЛЯ БУДУЧЫНІ КРАІНЫ

У Савеце Міністраў прайшло першае пасяджэнне рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Усебеларускага народнага сходу. Па словах прэм'ер-міністра Рамана ГАЛОЎЧАНКІ, кіраўніком краіны дадзена ўстаноўка правесці яго на высокім узроўні, працаваць над падрыхтоўкай якасна і аператыўна.

Фота БелТА.

«Правядзенне Усебеларускага народнага сходу з'яўляецца асабліва значнай для нашай краіны формай народаўладдзя. На гэтай пляцоўцы найбольш поўна рэалізуецца канстытуцыйнае права грамадзян нашай краіны ўдзельнічаць у абмеркаванні дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Гэта важная падзея ў многім вызначыць стратэгічныя кірункі сацыяльнага і эканамічнага развіцця Беларусі на будучую пяцігодку», — сказаў Раман Галоўчанка, які з'яўляецца старшынёй аргкамітэта.

На першым плане ў аргкамітэта задачы па вызначэнні даты, парадку правядзення форуму, колькасці яго ўдзельнікаў і планируемых да абмеркавання пытанняў. Як дадаў Раман Галоўчанка, неабходна ўлічваць пры арганізацыі і санітарна-эпідэміялагічную сітуацыю, «каб правесці мерапрыемства без рызыкі для здароўя грамадзян».

«Таксама неабходна забяспечыць для вылучэння на сход найбольш годных кандыдатур, запрасіць канструктыўных замежных гасцей, а таксама лідараў партый і грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку тых, хто мае сваё бачанне па пытаннях, што вынесуць на абмеркаванне. На Усебеларускім народным сходзе павінны прагучаць розныя думкі, розныя погляды на вырашэнне пытанняў, якія стаяць перад краінай», — заявіў кіраўнік урада.

Ён нагадаў, што асноўнае адрозненне будучага форуму ад мінулых у тым, што на абмеркаванне вылучаць не толькі сацыяльна-эканамічную тэматыку, але і выслухаюць ідэі па ўдасканаленні грамадска-палітычнай сістэмы.

«Плануецца, што абмеркаваныя на сходзе прапановы будуць акумуляваны і ўнесены на разгляд у якасці асновы для магчымых у перспектыве змяненняў», — падкрэсліў Раман Галоўчанка, але адзначыў, што асноўнымі пытаннямі ўсё ж застануцца эканоміка і разгляд праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021—2025 гады.

На першым пасяджэнні былі створаны працоўныя органы камітэта, якія будуць каардынаваць работу ў пэўных кірунках.

Кіраўніком рабочай групы па агульных пытаннях вызначаны першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта — Максім Рыжанкоў. Групай па абагульненні прапаноў, якія выпрацаваны ў ходзе агульнага абмеркавання актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця, будзе кіраваць намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кунцэвіч. Трэцюю групу, па каардынацыі СМІ і інфармацыйным суправаджэнні, узначаліць намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, далучыцца прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля Эйсмант. Групай па забеспячэнні бяспекі будзе кіраваць Аляксандр Рахманаў, намеснік дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі краіны. Працаваць з прадстаўнікамі дыпламатычнага корпуса, беларускімі дыяспарамі, міжнароднымі арганізацыямі, замежнымі гасцямі і кіраваць адпаведнай групай будзе першы намеснік міністра замежных спраў Аляксандр Гур'янаў. Групу па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні ўзначаліў Мікалай Селіванаў, намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта. Сакратарыят аргкамітэта возьме пад кіраўніцтва Канстанцін Бурак, кіраўнік Апарата Саўміна.

Марыя ДАДАЛКА.

Ва ўрадзе

Аб стратэгіі барацьбы з COVID-19, выпрабаванні вакцыны і калектыўным імунітэце

Колькасць людзей, якія заразіліся каранавірусам, у свеце перавысіла 50 мільёнаў. Як Беларусь падрыхтавалася да другой хвалі COVID-19, ці будуць узмацняцца абмежавальныя меры, ці можна ўжо казаць аб калектыўным імунітэце, як перажывае пандэмію турыстычны сектар, і ад чаго залежыць адкрыццё меж, у інтэрв'ю БелТА расказаў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.

Фота БелТА.

— Як можна ахарактарызаваць зараз сітуацыю з COVID-19 у Беларусі? Ці карэктавалася неяк стратэгія барацьбы з каранавірусам у параўнанні з вясновай хваляй?

— Цяпер у краіне адзначаецца тэндэнцыя да павелічэння колькасці выпадкаў інфекцыі COVID-19. Найбольшая колькасць зарэгістраваных выпадкаў захворвання прыпадае на дарослае насельніцтва (85,7 %), сярод якога больш за 50 % хворых — асобы працаздольнага ўзросту. На гэтым этапе эпідэмічны працэс характарызуецца большай інтэнсіўнасцю ў параўнанні з вясновым перыядам.

Стратэгія істотна не змянілася — вірус той жа. Усё найлепшае, што было напрацавана, выкарыстоўваецца і цяпер: механізмы ўзаемадзеяння органаў улады; шырокае правядзенне супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў на ўсіх узроўнях; адпрацаваная лагістыка з падзелам пацыентаў на больш лёгкіх, якія лечацца і назіраюцца дома, і цяжкіх, якіх шпіталізуюць у стацыянары; сістэма стацыянараў для рэабілітацыі, якая паказала сябе паспяхова; рэалізацыя комплексу санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. Адпаведныя меры прымаюцца ў кожным рэгіёне з улікам сённяшняй сітуацыі.

— Колькі ўстаноў аховы здароўя перавялі на ўзмоцнены рэжым работы?

— Цалкам перапрафіляваны для аказання меддапамогі пацыентам з COVID-19 у цэлым па краіне 18 устаноў аховы здароўя. Астатнія працуюць альбо ў звычайным штатным рэжыме, альбо з вылучэннем аддзяленняў для лячэння такіх пацыентаў.

На амбулаторным этапе працуе каля 1,1 тысячы кантактных брыгад для аказання дапамогі пацыентам з COVID-19 у амбулаторных умовах і 2,6 тысячы камандаў лекараў агульнай практыкі для работы з усімі астатнімі пацыентамі.

Рэзерв ложкавага фонду для лячэння пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй дастатковы. Для пацыентаў з інфекцыяй COVID-19 перапрафілявана больш за 19,6 тысячы ложкаў кароткатэрміновага знаходжання, што складае менш за 30 % ад гэтага фонду.

— Як у Беларусі ідуць клінічныя выпрабаванні расійскай вакцыны? Якія перспектывы яе ўкаранення ў якасці ўжо паўнавартаснай вакцыны? Ці будуць у краіне выпрабоўваць (і пасля закупляць) вакцыны іншых вытворцаў?

— У даследаваннях удзельнічаюць 4 мінскія паліклінікі. Усяго скрынінг перад вакцынацыяй прайшлі 109 чалавек, былі вакцынаваны 100. Усе добраахвотнікі назіраюцца 180 дзён з моманту першай вакцынацыі, 30 % з іх ужо зроблена другое ўвядзенне вакцыны. Па выніках назірання спецыялістаў на гэтым этапе даследавання ін'екцыі пераносяцца добра, без якіх-небудзь ускладненняў.

Пасля завяршэння даследавання вакцыны мы прааналізуем вынікі, атрымаем інфармацыю ад вытворцаў, што датычыцца комплекснай ацэнкі эфектыўнасці вакцыны. І толькі пасля гэтага будзе прынята рашэнне аб яе прымяненні ў краіне.

Што датычыцца вакцын іншых вытворцаў, то мы прапрацоўваем розныя варыянты, вывучаем па гэтай тэме ўсё.

— Ці дзейнічае імунітэт у грамадзян, якія перанеслі COVID-19 падчас вясновай хвалі?

— Імунітэт у тых, хто перанёс інфекцыю раней, ёсць. Пытанне ў яго выяўленасці і эфектыўнасці. На жаль, у шэрагу перахварэлых антыцелы не рэгістраваліся ці іх узровень быў нізкі. То-бок у гэтых грамадзян сфарміраваўся нізкі імунітэт. Гэта становіцца прычынай паўторных заражэнняў. У свеце паўторныя выпадкі захворвання назіраюцца ў менш чым 0,5—1 % тых, хто раней хварэў.

Спецыялісты папярэдне ацэньваюць папуляцыйны імунітэт у краіне пасля першай хвалі на ўзроўні 15—20 %. Больш дакладныя звесткі мы зможам атрымаць пазней, калі будуць праведзеныя даследаванні за больш працяглы перыяд, хоць бы 1-2 гады.

— Для медыкаў увялі надбаўкі за барацьбу з каранавірусам. Які аб'ём сродкаў ужо накіраваны на гэтыя мэты? І ў якую суму для бюджэту абыходзіцца кошт лячэння аднаго пацыента з COVID-19?

— Названыя надбаўкі выплачаныя больш чым 51 тысячы работнікаў аховы здароўя, на гэтыя мэты накіравана звыш 350 мільёнаў рублёў.

Адзін ложка-дзень лячэння пацыента з COVID-19 у аддзяленні анестэзіялогіі-рэанімацыі каштуе каля 800 рублёў.

— Ці ёсць перадумовы для ўвядзення зараз дыстанцыйнага навучання для школьнікаў і студэнтаў?

— Пакуль перадумоў для ўвядзення дыстанцыйнага навучання для школьнікаў няма. На працягу першай чвэрці школу наведвалі не менш за 85 % навучэнцаў, па хваробе прапускалі навучальныя заняткі не больш за 11 % школьнікаў.

У ВНУ навучальныя групы, дзе ёсць хворыя на COVID-19, перахо-дзяць на аддалены фармат навучання з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій. Сёння ў такім фармаце навучаецца не больш за 10 % студэнтаў.

— Адна са сфер, якая найбольш пацярпела праз пандэмію, — турыстычная, якую вы курыруеце ва ўрадзе. Як беларускі турызм перажывае гэты няпросты час? Вядома, што каля 400 тысяч беларусаў унеслі грошы за пуцёўкі, але далёка не ўсе з'ехалі на адпачынак. Як атрымалася ўрэгуляваць сітуацыю?

— Яшчэ вясной разам з вядучымі грамадскімі аб'яднаннямі ў сферы турызму выпрацаваны алгарытм вырашэння спрэчак з турыстамі. Сутнасць яго заключаецца ў індывідуальным вырашэнні кожнага канкрэтнага выпадку ў рамках дзеючага заканадаўства (Грамадзянскі кодэкс, законы «Аб абароне правоў спажыўцоў» і «Аб турызме»). Гэты алгарытм прадугледжвае некалькі варыянтаў — пераносе тура, вяртанне грашовых сродкаў з адтэрміноўкай, дэпаніраванне грашовых сродкаў на наступны год.

У большасці выпадкаў турыстычным фірмам атрымалася дамовіцца са сваімі кліентамі і заключыць дадатковыя пагадненні па адным з названых варыянтаў. Частку пытанняў удалося вырашыць пасля адкрыцця меж і аднаўлення работы турыстычнага сектара.

Прававыя нормы, якія дадаткова рэгулююць гэтыя пытанні, будуць прадугледжаны ў новым законе «Аб турызме» (страхаванне, стварэнне спецыяльнага фонду або банкаўская гарантыя). Гэта, з аднаго боку, забяспечыць «падушку бяспекі» для турыстычных фірмаў, з другога — гарантыю вяртання грашовых сродкаў турыстам. Адпаведны законапраект унесены ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёлета ў маі.

Сітуацыя, якая склалася, — нагода для развіцця ўнутранага турызму. Сёння ў больш выгадным становішчы аказаліся тыя турыстычныя арганізацыі, якія змаглі аператыўна пераарыентавацца на продаж тураў і экскурсій унутры краіны.

Месяц таму на пасяджэнні міжведамаснага экспертна-каардынацыйнага савета па турызме пры Савеце Міністраў быў выпрацаваны шэраг стымуляцыйных мер як для беларусаў, якія вандруюць унутры краіны, так і для турыстычных фірмаў. Гэта і развіццё новых маршрутаў, і паляпшэнне інфраструктуры, і маркетынгавыя мерапрыемствы, і палітыка падатковых ільгот і прэферэнцый, і гнуткая цэнавая палітыка, і іншыя меры. Унутраны турызм мае вялікія перспектывы.

— Пэўную падтрымку турыстычнага сектара магло б даць аднаўленне транспартных зносін у поўнай меры. Калі можна будзе разлічваць на аднаўленне чыгуначных і аўтобусных зносін з Расіяй?

— Беларускі бок гатовы да аднаўлення чыгуначных і аўтамабільных зносін з Расіяй. Аб прымаемых мерах для аднаўлення зносін мы інфармавалі нашых расійскіх калег падчас рэгулярных кансультацый, якія праводзяцца паміж Міністэрствам аховы здароўя і Расспажыўнаглядам, на іншых інтэграцыйных пляцоўках.

Зараз напружаная эпідэміялагічная сітуацыя, таму рашэнне аб аднаўленні аўтамабільных і чыгуначных пасажырскіх зносін будзе прымацца з улікам змянення сітуацыі.

— Беларусь абмежавала ўезд на сваю тэрыторыю замежнікаў. Як доўга можа дзейнічаць гэтая мера?

— Гэтая мера часовая, і тэрмін яе дзеяння будзе залежаць ад развіцця эпідэміялагічнай сітуацыі ў краінах-суседзях. Пакуль жа рабіць нейкія прагнозы рана, бо ўсюды адзначаецца няўхільны рост захворванняў.

Навука — грамадству

Электронна-прамянёвая зварка і біяраскладальная ўпакоўка

Больш як 250 навуковых распрацовак ukaранілі за мінулы перыяд бягучага года айчынныя акадэмічныя арганізацыі. Зараз у НАН Беларусі рыхтуецца зборнік з іх пералікам, які будзе накіраваны ва ўсе міністэрствы і ведамствы для пашырэння кола спажыўцоў прадукцыі, тэхналогій і матэрыялаў, распрацаваных акадэмічнымі навукоўцамі. Пра гэта паведаміў галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук, старшыня Савета маладых вучоных Андрэй ІВАНЕЦ.

Фота прэс-службы Нацыянальнай акадэміі навук.

У іх ліку, напрыклад, беспілотны лятальны апарат «Буравеснік МН», асвоены ў НПЦ шматфункцыянальных беспілотных комплексаў НАН. Аналагаў яму ў Беларусі няма, прычым комплекс значна ніжэйшы па кошце за замежныя распрацоўкі.

Хімікі і мікрабіёлагі актыўна працуюць над стварэннем новых матэрыялаў і тэхналогій для ачышчэння вады. У прыватнасці, над стварэннем новых мікрабіялагічных прэпаратаў, якія дазваляюць праводзіць ачыстку гаспадарчых і пітных сцёкавых вод, у першую чаргу, прамысловых, ад таксічных прымесяў. Гэта, на думку Андрэя Іванца, дасць магчымасць павысіць як экалагічнасць нашых прамысловых прадпрыемстваў, так і якасць пітнога водазабеспячэння насельніцтва.

На папяровай фабрыцы Дзяржзнака ў Барысаве ўжо наладжана вытворчасць актыўнага біяраскладальнага папяровага матэрыялу. Размова ідзе пра выпуск спецыяльнай устойлівай да тлушчаў і вільгаці паперы з кансервавальнымі ўласцівасцямі.

Вучоны сакратар Інстытута фізіялогіі, старшыня Савета маладых навукоўцаў аддзялення медыцынскіх навук НАН Беларусі Маргарыта ДОСІНА расказала пра цікавую распрацоўку Цэнтра мозга, які з'явіўся ў Інстытуце фізіялогіі ў 2018 годзе:

— Мы мадэлюем розныя тыпы паталогій і спрабуем знайсці рашэнні. Адна з нашых распрацовак — біячып, прызначаны для вывучэння нейронных сетак, функцый галаўнога мозга і распрацоўкі ў будучыні новых падыходаў да лячэння і аднаўлення яго структур.

Разам са спецыялістамі РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі акадэмічныя вучоныя распрацавалі і ўводзяць у практыку методыку лячэння траўм мозга і інсультаў (ішэмічнага і гемарагічнага) з выкарыстаннем мезенхімальных ствалавых клетак, узятых з тлушчавых тканак самога пацыента. Адметнасць гэтага метаду ў параўнанні з замежнымі заключаецца ў спосабе дастаўкі ствалавых клетак. Апошнія ўводзяцца не ў крывяносную сістэму, а ў вобласць канчаткаў двух чэрапна-мазгавых нерваў у поласці носа або ў трайчасты нерв. Адтуль яны самастойна ўздоўж нерваў мігрыруюць у мозг і размяшчаюцца ў разбураных ачагах. Прычым там яны могуць апынуцца ўжо праз паўгадзіны.

Яшчэ адна важная эксперыментальная распрацоўка Інстытута фізіялогіі — інгаляцыйны, які падае разагрэтую да 70 градусаў кіслародна-геліевую сумесь. Гелій папярэджвае апёк дыхальных шляхоў у пацыента, разам з тым згубна ўздзейнічае на каранавірус. Працягласць лячэбнага сеанса вар'іруецца ад 5 да 30 хвілін, а прыстасаванне можа выкарыстоўвацца як ва ўмовах стацыянара, так і ў дамашніх умовах.

— Сёння Нацыянальная акадэмія навук супрацоўнічае з найбуйнейшымі навуковымі цэнтрамі больш чым ста краін свету: Рэспублікі Карэя, Японіі, Германіі... На базе навуковых арганізацый НАН дзейнічаюць 42 міжнародныя даследчыя цэнтры і лабараторыі розных узроўняў. Вядзецца падрыхтоўка да стварэння яшчэ дзесяці. Найбольш дынамічным з'яўляецца супрацоўніцтва з калегамі з Кітая, нават нягледзячы на няпростую эпідэміялагічную сітуацыю, — падкрэсліў Андрэй Іванец.

Трывалыя сувязі наладжаны і з расійскімі навукоўцамі, у прыватнасці, з арганізацыямі Расійскай акадэміі навук. «У сувязі з уводам у эксплуатацыю Беларускай АЭС вельмі важным нам бачыцца ўзаемадзеянне беларускіх і расійскіх фізікаў-ядзершчыкаў. Курчатаўскі інстытут і Аб'яднаны інстытут ядзерных даследаванняў у Дубне — два найбуйнейшыя навуковыя цэнтры, якія шмат у чым з'яўляюцца лідарамі ў гэтай сферы. Мы вельмі дынамічна працуем разам», — дадаў Андрэй Іванец.

А літаральна днямі ў НАН Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё Навукова-вытворчага цэнтра электронна-прамянёвых тэхналогій. Ён аснашчаны ўнікальным тэхналагічным абсталяваннем, прыстасаваным для электронна-прамянёвай зваркі, у тым ліку розных металаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Малодшы брат імператара Японіі абвешчаны яго нашчадкам

Наследным прынцам імператарскага двара Японіі стаў прынц Фуміхіта, малодшы брат імператара Нарухіта. Згодна з японскай традыцыяй, на трон можа ўзысці толькі мужчына, а сыноў у цяперашняга манарха няма. Цырымонія інвеституры новага спадчынніка прайшла ў Токіа. Яна павінна была адбыцца яшчэ ў красавіку, але была адкладзеная з-за пандэміі каранавіруса. Прынцу 54 гады, і ён усяго на шэсць гадоў маладзейшы за свайго брата. Яго афіцыйныя тытулы — прынц Ая, а таксама прынц Акісіна. Нашчадкам Хрызантэмавага трона ён лічыўся з мая 2019 года, хоць афіцыйная цырымонія адбылася толькі цяпер. Як і яго дзядуля, колішні імператар Сёва (Хірахіта), прынц Фуміхіта цікавіцца арніталогіяй і нават абараніў доктарскую дысертацыю па гэтым прадмеце. Аб прынцы таксама вядома, што ён любіць гуляць у тэніс, а яшчэ яму падабаецца музыка «Бітлз» і ў яго трое дзяцей. Калі ён стане імператарам, то яго нашчадкам будзе сын Хісахіта.

ААН назвала краіны, якім пагражае голад

Недахоп харчавання для насельніцтва ў цяперашні час зафіксаваны ў Буркіна-Фасо, Нігерыі, Паўднёвым Судане і Емене. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва Anadolu са спасылкай на справаздачу Міжнароднай арганізацыі харчавання FAO, якая ўваходзіць у структуру ААН. У дакладзе падкрэсліваецца, што ў згаданых краінах адбываюцца ўзброеныя канфлікты, і гэта ў першую чаргу пагаршае сітуацыю з харчовай бяспекай. У дакладзе адзначаецца, што яшчэ 16 краін знаходзяцца ў групе высокай рызыкі росту вострага голаду. Гэта Венесуэла, Гаіці, Афганістан, Сірыя, Ліван, Судан, Эфіопія, Самалі, Мазамбік, Сьера-Леонэ, Малі, Нігер, Камерун, Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Зімбабвэ. «Мы знаходзімся на катастрафічным павароце. І зноў мы сутыкаемся з рызыкай голаду адначасова ў чатырох розных частках свету. Калі мы абвяшчаем пра голад — гэта азначае, што ўжо страчана шмат жыццяў. Калі мы пачакаем, каб даведацца аб гэтым дакладна, людзі будуць ужо мёртвыя», — заявіла дырэктар FAO па надзвычайных сітуацыях Маргарыта ван дэр Вельд.

У Францыі стартавала кругасветная рэгата

У горадзе Ле Сабль-д'Алон на захадзе Францыі стартавала дзявятая кругасветная рэгата яхт-адзіночак Vendée Globe. Яна праводзіцца раз у чатыры гады. 33 шкіперы перасеклі лінію старту, затрымаўшыся больш чым на гадзіну з-за густога тумана. Пачатак спаборніцтва адбываўся ў асаблівых умовах каранціну — гледачоў не было. Па правілах рэгаты яхт-адзіночак Vendée Globe ўдзельнікі не маюць права звяртацца да чыёй-небудзь дапамогі і рабіць прыпынкі падчас шляху. Таму многія спартсмены сыходзяць з дыстанцыі яшчэ ў першыя дні. Адной з самых вялікіх праблем для яхтсменаў з'яўляецца недахоп сну — спаць даводзіцца ўрыўкамі па некалькі хвілін. Да рэгаты дапускаюць толькі самых вопытных спартсменаў. Спаборніцтва пачынаецца і завяршаецца ў французскім горадзе Ле Сабль-д'Алон рэгіёна Вандэя (адсюль і назва «кругасветкі»). Гонка доўжыцца каля трох месяцаў.

Надвор'е

Холадна, а яшчэ і замаразкі...

Упершыню з пачатку восені тэмпература наблізілася да сваёй кліматычнай нормы

У многіх рэгіёнах слупок тэрмометра ўпершыню ў гэтым сезоне пакажа адмоўныя значэнні. Такі працяглы перыяд без восеньскіх замаразкаў адзначаецца ў многіх рэгіёнах краіны ўпершыню, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У сераду будзе воблачна з праясненнямі і пераважна без ападкаў. У асобных раёнах чакаецца туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы. Тэмпература паветра ноччу складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, месцамі пры праясненнях — 5 марозу. Удзень будзе ад 1 да 8 градусаў цяпла.

Не чакаецца ападкаў і ў чацвер. У гэты дзень будзе воблачна з праясненнямі. У асобных раёнах магчымы туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ў начны час складзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, пры праясненнях — да мінус 5 градусаў. Удзень таксама будзе халаднавата — 1—7 цяпла.

Надвор'е пачне злёгку мяняцца толькі ў пятніцу. У гэты дзень яшчэ захаваецца павышаны фон атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў. Толькі ўдзень да меж краіны наблізіцца малаактыўны франтальны раздзел з Польшчы, і ў асобных раёнах па захадзе краіны магчымы кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы галалёд. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, па ўсходзе пры праясненнях — да мінус 5 градусаў. Удзень будзе 1—8 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя праз Беларусь будзе перамяшчацца малаактыўны франтальны раздзел. У суботу ў асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Месцамі чакаецца туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, удзень — 1—8 градусаў вышэй за нуль.

Сяргей КУРКАЧ.

Сенсацыя

Выратаванне Джыны

Ветэрынарны ўрач выходжвала нованароджанае львяня ва ўласнай кватэры

Нядаўна ў пары львоў Гродзенскага заапарка нарадзілася малое. Але радасная падзея ледзь не завяршылася трагічна: праз 10 дзён ільвіца перастала яго карміць. Клопат аб нованароджаным драпежніку ўзяла на сябе ветэрынарны ўрач Алена КАМАРЭЦ.

Увогуле, нараджэнне нашчадка львоў стала сюрпрызам нават для саміх работнікаў заапарка. У канцы верасня падчас абходу загадчыца секцыі драпежных жывёл убачыла, што львіца ў вальеры не адна.

— Мы чакалі прыплод летась, калі наш леў Джоні праўляў інтарэс да львіцы Персеі. Але тады нашчадак так і не з'явіўся. Мы падумалі, што гэта з-за ўзросту львіцы — ёй 11 гадоў, і яна яшчэ ні разу не была маці. Таму з'яўленне малечы гэтай восенню стала для ўсіх сапраўдным шокам і разам з тым вельмі радаснай падзеяй, — расказала Алена Камарэц.

Работнікі заапарка рабілі ўсё, каб забяспечыць адпаведны догляд, цішыню і спакой для маці і нованароджанай. Стараліся не турбаваць яе, гатавалі спецыяльную ежу. І ўсё ішло добра. Але праз 8-10 дзён у заапарку сталі заўважаць, што звяраня не актыўнае, вялае, амаль не ўстае. З дапамогай відэаназірання ўстанавілі, што львіца папросту не корміць сваё малое. Было вырашана тэрмінова забраць яго ад маці і перавесці на штучнае кармленне.

А паколькі ва ўмовах заапарка забяспечыць кругласутачны нагляд немагчыма, ветэрынар Алена Камарэц забрала маленькую да сябе ў кватэру, дзе звераня правяло некалькі тыдняў.

— Было шмат клопатаў, але цяпер сітуацыя стабілізавалася, малая львіца стала нармальна есці, таму вырашылі вярнуць яе ў заапарк, — паведаміла суразмоўніца. — Праўда, для шырокага агляду яна недаступная.

У новай насельніцы заапарка ўжо ёсць і свая мянушка — яе назвалі Джына. Гэта гучнае і кароткае імя, якое, па словах работнікаў установы, добра ўспрымаецца на слых. Джына даглядаецца, згодна з графікам. Ёсць у яе і позняе вячэрняе кармленне, дзеля якога работнікі заапарка спецыяльна прыходзяць а 9-10-й гадзіне вечара.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Важна не страціць

Віктар СВІЛА.

Віктар ЧАЙЧЫЦ.

Ала ШАЎЦОВА.

Дзмітрый ШАЎЦОЎ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Віктар Свіла: Упершыню кіраўнік дзяржавы заявіў пра гэта публічна падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» 1 сакавіка 2019 года. Потым пацвердзіў у Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Ён сказаў, што мы ўжо прайшлі той этап, калі нам патрэбна была моцная цэнтралізаваная ўлада, надышоў час нагружаць уладнымі паўнамоцтвамі іншыя структуры і галіны ўлады.

Віктар Чайчыц: Усе згодныя, што Канстытуцыя — гэта жывы арганізм: змяняецца жыццё, змяняецца заканадаўства. Змяненні, якія былі ўнесеныя ў 1996 годзе, на мой погляд, на той момант адпавядалі патрабаванням часу. Тады спатрэбілася ўзмацненне вертыкалі, каб аператыўна вырашаць архіважныя пытанні, напрыклад, супрацьстаяць таму ж разгулу злачыннасці. Цяпер мы ўбачылі, што частку паўнамоцтваў ад Прэзідэнта можна ўжо перадаць парламенту, Савету Міністраў, на мясцовы ўзровень. Не трэба думаць, што мы гэта робім або пад ціскам, або каб дагадзіць некаму. Калі дагадзіць, то толькі нашым грамадзянам.

Цяпер пытанне змянення Канстытуцыі яшчэ больш наспела, і людзі сталі праяўляць актыўнасць. Ні ў якім разе нельга яе падаўляць: калі ласка, прапаноўвайце, кажыце, мы будзем спрабаваць рэалізоўваць вашы ідэі. Праўда, часам людзі надзвычай спрошчана разумеюць, што такое Канстытуцыя, іх прапановы вельмі асабістыя. Гэта датычыцца як грамадзян, так і арганізацый і аб'яднанняў.

Віктар Свіла: Мы на сёння стварылі досыць жыццяздольную сістэму дзяржаўнага ладу, усе галіны ўлады сфарміраваныя і працуюць, наступіў перыяд, калі можна пераразмяркоўваць паўнамоцтвы. Уласна кажучы, гэты працэс ужо адбываецца. Нядаўна кіраўнік дзяржавы расказаў пра прапанову перанесці больш за 70 паўнамоцтваў ад Прэзідэнта на ўсе ўзроўні ўлады. Праўда, гэта не тыя паўнамоцтвы, што вызначаны ў адпаведным артыкуле Канстытуцыі, але іх вытворныя.

«ЛЮБЫЯ ПРАПАНОВЫ ВАЖНЫЯ»

Дзмітрый Шаўцоў: Заканатворчасць — гэта цэлая навука і вельмі карпатлівая работа. Калі ў 2012 годзе я стаў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў пятага склікання, то думаў: дайце пункт апоры — і я перакулю свет. Але калі садзіўся з калегамі за круглы стол, то юрысты мне тлумачылі, што адна мая папраўка надта прыватнага характару, другая ідзе ў разрэз з дзеючым заканадаўствам, трэцяя не будзе працаваць. Тады я пачынаў глядзець на заканатворчы працэс больш рознабакова і ўжо сам адкідваў некаторыя ідэі. Асобныя мае прапановы ўсё ж такі трапілі ў Закон «Аб ахове здароўя», але іх фармулёўка запатрабавала велізарнай работы і дапамогі праваснаўцаў.

«Звязда»: Навошта тады патрэбна шырокае абмеркаванне паправак у Канстытуцыю?

Дзмітрый Шаўцоў: Грамадскае абмеркаванне неабходна для прыняцця многіх законаў, асабліва калі яны закранаюць сацыяльную сферу. Для абмеркавання іх праектаў ствараюцца дыскусійныя пляцоўкі, грамадскія прыёмныя, яны размяшчаюцца ў агульны доступ. Там таксама адсейваецца частка прапаноў, частка выкарыстоўваецца на іншым узроўні, а частка ўлічваецца, бо аказваецца слушнай.

Ала Шаўцова: Большая частка прапаноў будзе рэалізаваная. Калі не на ўзроўні Канстытуцыі, то на ўзроўні Грамадзянскага, Падатковага кодэксаў, Кодэкса аб шлюбе і сям'і і іншых нарматыўных прававых актаў, што з'яўляюцца фундаментам сацыяльных, эканамічных каштоўнасцяў. Грамадзяне будуць пачутыя — пытанне часу. Ён неабходны, каб заканадаўчы орган змог прапановы прапрацаваць і выйсці на ўзровень унясення змяненняў і дапаўненняў у прававыя акты. Звярніце ўвагу: мы набылі суверэнітэт фармальна ў 1990 годзе, калі 27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў Дэкларацыю «Аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь». Дакумент абвяшчаў самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады Беларусі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць. І толькі ў 1999-м, амаль праз 10 гадоў, прынялі асноўную колькасць кадыфікаваных актаў.

«Так было і з Канстытуцыяй 1994 года: у рабочых камісіях, якія яе распрацоўвалі, узнікла вострая дыскусія вакол тэрміну «сацыяльная дзяржава», вельмі многія нават спецыялісты не да канца разумелі, што гэта такое, праводзілі паралель, а часам і атаясамлівалі з тэрмінам «сацыялістычны».

Такім чынам, цяпер надышоў этап, калі колькасць павінна перарасці ў якасць. Сёння змены ў грамадстве, эканоміцы, палітыцы, адукацыі, ахове здароўя, жыллёвай палітыцы настолькі колькасна выраслі, што неабходна якаснае заканадаўства. Не здзіўляюся, што прапановы актывізтаў зараз датычацца не столькі змен канстытуцыйнага акта, колькі дзеючага заканадаўства. Гэта крэдыт даверу, які дае народ, каб змянілася дзеючае заканадаўства ў нейкіх сферах.

Цяпер заканадаўчаму органу, міністэрствам, камітэтам, дэпартаментам прасцей будзе працаваць, таму што фактычна прайшло апытанне грамадскага меркавання, якое мае вялікую важнасць. Мы разумеем, чаго людзі хочуць і якія рэформы жадаюць убачыць.

Пытанне зараз не толькі ў змяненнях у Канстытуцыю. Пытанне ў тым, што прайшло дастаткова часу пасля таго, як краіна ўстала з каленяў перад эканамічнымі і сацыяльнымі праблемамі, якія былі ў 1990-я гады. Канстытуцыя — гэта як сцяг у грамадстве, і толькі вяршыня айсберга ў заканадаўстве. Прыняццем новай Канстытуцыі праблемы не вырашацца. Недарэмна ж існуе паняцце дэкларатыўнай Канстытуцыі. Зрабі яе хоць «залатую», але калі ў грамадстве не будзе нічога змяняцца, яна не будзе працаваць. Сёння пытанне не толькі ў Асноўным Законе, а ў тым, як будуць змяняцца кіраванне, эканоміка, сацыяльная сфера, ахова здароўя, адукацыя і іншае.

Я памятаю, як прымаўся Адміністрацыйны кодэкс. Яго ўносяць на разгляд у Савет Рэспублікі, а ўжо паступаюць прапановы па змяненні і дапаўненні акта. Гэта быў адзін з самых змяняемых прававых актаў. Таму справа не ў тым, што была дадзена адмашка мяняць Канстытуцыю з-за пратэстаў, а ў тым, што грамадства да гэтага даспела. Час прыйшоў.

Віктар Чайчыц: У Канстытуцыі ўсяго не прапішаш. Гэта — Асноўны Закон, закон законаў. Але цяпер любыя прапановы грамадзян важныя для дзяржавы і грамадства. Нават калі нейкія прапановы не ўвойдуць у Канстытуцыю (большасць не ўвойдзе па аб'ектыўных прычынах, пра якія мы тут сказалі), яны ўсё роўна карысныя для ўсёй галіны дзяржаўнай улады, каб убачыць, што людзей хвалюе. Іншыя кампетэнтныя органы, напрыклад, Савет Міністраў, выканкамы, органы мясцовага самакіравання будуць займацца гэтымі пытаннямі.

Над Канстытуцыяй у канчатковай рэдакцыі павінны працаваць прафесіяналы: юрысты, нарматворцы, але з улікам прапаноў, якія атрыманы ад грамадзян. Зараз больш за ўсё прапаноў датычыцца сацыяльных аспектаў: пенсій, адпачынкаў па доглядзе за дзецьмі... І так было заўсёды. Падчас грамадскага абмеркавання праекта закона «Аб нарматыўных прававых актах», прапаноў, лічы, не было. А калі абмяркоўвалі змяненні ў заканадаўства «Аб абыходжанні з жывёламі», то прапаноў была вялізная колькасць.

Вельмі важна, каб меркаванні ўсіх былі ўлічаны і накіраваны ў адпаведнасці з кампетэнцыяй. Мы павінны кіравацца прынцыпам: калі нехта нас не зразумеў, гэта не яго віна, а наша — у тым, што не змаглі растлумачыць. Зараз нам трэба растлумачыць людзям, што большасць іх прапаноў будзе разгледжана на іншым узроўні. Інакш крыўды, што гэтыя прапановы не ўвайшлі ў Канстытуцыю, можа быць шмат. І гэта трэба будзе ўлічыць парламенту і ўсім.

ЗАДАВАЦЬ ВЕКТАР РАЗВІЦЦЯ ДЗЯРЖАВЫ

Ала Шаўцова: Хачу правесці паралель: работа над тэкстам Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў ААН пачалася ў 1945 годзе, а прынятая яна была толькі ў 1948 годзе, таксама ж работа над тэкстамі двух пактаў па правах чалавека была пачатая ў 1951 годзе, а прынятыя яны былі толькі ў 1966 годзе. Распрацоўка любога нарматыўнага прававога дакумента, тым больш Канстытуцыі, — гэта складаная, карпатлівая, адказная работа многіх спецыялістаў. Трэба заўсёды ўлічваць, што ў кожнага нарматыўнага прававога акта ёсць свая задача, якая павінна адпавядаць патрабаванням часу, мэтам і зместу. Людзі, якія сёння прыцягнутыя да абмеркавання змяненняў у Канстытуцыю, сапраўды, павінны разумець юрыдычную сілу гэтага дакумента, якім ён павінен быць па структуры, тое, што яна будзе адлюстроўваць не толькі існуючыя асновы дзяржаўнага (канстытуцыйнага) ладу, але і вызначаць мэты, задачы будучага развіцця дзяржавы і грамадства: якія тут павінны быць прававыя, ідэалагічныя, палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя пазіцыі.

Так было і з Канстытуцыяй 1994 года: у рабочых камісіях, якія яе распрацоўвалі, узнікла вострая дыскусія вакол тэрміну «сацыяльная дзяржава», вельмі многія нават спецыялісты не да канца разумелі, што гэта такое, праводзілі паралель, а часам і атаясамлівалі з тэрмінам «сацыялістычны». Напрыклад, цяпер не ўсе разумеюць, што ў першым артыкуле многія пазіцыі прапісаныя: і прававая, і дэмакратычная, і сацыяльная дзяржава. Не бачаць вытворных адсюль змястоўных аспектаў. Прапануюць некаторыя катэгорыі, якія жадаюць убачыць у Канстытуцыі, але яны ў ёй ужо ёсць.

Мне ўвогуле вельмі падабаецца першы раздзел Асноўнага Закона. У яго ўвайшлі амаль усе палажэнні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, якая была прынятая ў 1990 годзе на піку вельмі сур'ёзных палітычных падзей. Цікава, што тады для аўтараў быў пастаўлены надзвычай кароткі тэрмін — некалькі дзён. Адзін з іх, мой навуковы кіраўнік, прафесар Анатоль Аляксандравіч Галаўко, расказваў, як гэта было цяжка. Сёння мы кажам пра перафармаціраванне іншых частак Канстытуцыі: у частцы пераразмеркавання паўнамоцтваў дзяржаўных органаў, рэдагавання правоў і свабод чалавека, асобных паўнамоцтваў мясцовых Саветаў дэпутатаў і Канстытуцыйнага суда, асноў фінансава-крэдытнай сістэмы.

Канстытуцыя — гэта не аднамомантны акт. Яна павінна дзейнічаць доўга, быць устойлівай. І ў ёй павінны быць прапісаныя нормы, актуальныя не толькі тут і цяпер, не толькі тое, што хвалюе грамадства сёння. Сацыяльна-эканамічныя пытанні — вельмі дынамічная сфера: сёння актуальныя адны пенсіі, заўтра — іншыя, сёння актуальныя адны адпачынкі па доглядзе за дзіцем, заўтра — іншыя. Тое ж датычыцца эўтаназіі, абортаў... Мы не можам па гэтых пытаннях уносіць кожны раз змяненні ў канстытуцыйны акт. Ён павінен быць перспектыўны, застацца нашым дзецям. Канстытуцыя ЗША дзейнічае амаль 300 гадоў, таму што і цяпер у ёй прапісаны толькі грунтоўныя асновы дзяржаўнага ладу.

«Асноўны масіў прапаноў, якія паступаюць, датычыцца парадку абрання, фарміравання, тэрмінаў паўнамоцтваў Прэзідэнта і парламента. Ёсць тыя, што датычацца развіцця шматпартыйнай сістэмы, удзелу палітычных партый у выбарах. Гэта, калі казаць пра рэчы, якія адносяцца да распараджэння Канстытуцыі».

А ў Вялікабрытаніі ўвогуле няма канстытуцыйнага акта. Там яго прадстаўляюць кансалідаваныя законы. Канстытуцыя Іспаніі, напрыклад, вельмі аб'ёмная, у ёй шмат падрабязнасцяў, дэталяў, але гэта не ёсць добра, у выніку дастаткова ўнутрыпалітычных праблем, у тым ліку з Каталоніяй. Канстытуцыя павінна насіць стабільны і перспектыўны характар, задаваць вектар развіцця дзяржавы.

Дарэчы, Канстытуцыя СССР 1937 года для свайго часу была бліскучым нарматыўным прававым актам. Шкада, што ў шырокай літаратуры няма імёнаў юрыстаў, якія яе пісалі. Праз 10 гадоў яна аказала каласальны ўплыў на краіны сацыялістычнай арыентацыі і на працэс прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. У ёй бездакорна былі прапісаныя правы і свабоды. Мы кажам тут пра нарматыўны акт, а не пра сацыяльна-палітычную сістэму, якая на той момант існавала. Тая Канстытуцыя праіснавала амаль 40 гадоў.

давер людзей

РАБОТА З ПРАПАНОВАМІ Ў ПАРЛАМЕНЦЕ

Віктар Свіла: Збор прапаноў распачаўся 2 кастрычніка, ён працягваецца, актыўнасць людзей не падае. На канец кастрычніка колькасць прапаноў налічвала тысячы.

Людзі, якія ўносяць гэтыя прапановы, не абавязаныя быць юрыстамі. Яны выказваюць свае пажаданні, меркаванні. Ёсць два варыянты выкарыстаць гэта. Мы ў Палаце прадстаўнікоў вырашылі, што ўсе прапановы, якія не датычацца Канстытуцыі, будуць разменкаваныя па нашых профільных Камісіях у якасці «сыравіны» для далейшай работы над канкрэтнымі законапраектамі.

Лічу, што вынікам збору прапаноў павінен стаць нейкі агрэгіраваны прадукт, які ўлічвае агульнае меркаванне. Няхай яго будзе цяжка сфармуляваць дакладна, але пэўная пазіцыя павінна быць выкладзена. Бо ўсенароднае абмеркаванне патрэбна, каб атрымаць устойлівы дакумент, разлічаны на доўгі перыяд часу, які вызначыць далейшае развіццё нашай краіны.

Я ўжо прыводзіў у СМІ прыклад канкрэтных прапаноў: адна з іх датычыцца замацавання ў Канстытуцыі палажэння пра тое, што шлюб — гэта добраахвотны саюз выключна паміж мужчынам і жанчынай. Дарэчы, з 400 каментарыяў адной з дыскусійных пляцовак у інтэрнэце траціна датычыцца менавіта падобных пытанняў: гендарнай роўнасці, шлюбна-сямейных адносін і падобнага. Ёсць прапанова больш шырока адлюстраваць у Канстытуцыі пазіцыю рэлігіі. Частка прапаноў з'яўляюцца дыяметральна супрацьлеглымі па адной і той жа тэме. У гэтым складанасць апрацоўкі ўсяго масіву інфармацыі. Калі мы прымаем нечы бок, нам трэба абгрунтаваць — чаму, бо ёсць і іншы пункт гледжання.

Цікава, што ў Расійскай Федэрацыі пайшлі шляхам прыняцця Закона «Аб удасканаленні рэгулявання асобных пытанняў арганізацыі і функцыянавання публічнай улады». Мы таксама можам разгледзець падобны спосаб унясення змяненняў у Канстытуцыю.

Асноўны масіў прапаноў, якія паступаюць, датычыцца парадку абрання, фарміравання, тэрмінаў паўнамоцтваў Прэзідэнта і парламента. Ёсць тыя, што датычацца развіцця шматпартыйнай сістэмы, удзелу палітычных партый у выбарах. Гэта калі казаць пра рэчы, якія адносяцца да Канстытуцыі.

Нягледзячы на тое што вялікая колькасць выказаных ідэй датычыцца нарматыўных прававых актаў больш нізкага ўзроўню, мы стараемся ні ў якім разе не пагасіць актыўнасць людзей. Мне вельмі падабаецца, што гэты працэс набірае ўсё большы размах і мае перспектыву.

«Звязда»: Фінал абмеркавання адбудзецца падчас Усебеларускага народнага сходу?

Віктар Свіла: Што да алгарытму ўнясення змяненняў у Канстытуцыю, яго агучыў Прэзідэнт падчас Паслання беларускаму народу і парламенту: шырокае вывучэнне грамадскага меркавання — вынясенне прапаноў на Усебеларускі народны сход — рэферэндум — унясенне змяненняў.

«Мы набылі суверэнітэт фармальна ў 1990 годзе, калі 27 ліпеня 1990 года Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў Дэкларацыю «Аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь». Дакумент абвяшчаў самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады Беларусі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць. І толькі ў 1999-м, амаль праз 10 гадоў, прынялі асноўную колькасць кадыфікаваных актаў».

ФАРМАТ ДЫЯЛОГАВЫХ ПЛЯЦОВАК

Віктар Свіла: На дыялогавай пляцоўцы ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, дзе мне давялося паўдзельнічаць, не ўсе з тых, хто прадстаўляе сябе апанентам дзеючай улады, аказаліся гатовыя весці канструктыўны дыялог. Але пачуць адзін аднаго можна, толькі калі з павагай ставішся да апанента, не вырываеш мікрафон і даеш магчымасць сказаць усё.

Зараз актыўна вядзецца размова аб партыйным будаўніцтве. У нашай краіне зарэгістравана 15 партый, у парламенце прадстаўлена дэпутатамі пяць з іх. Задача кожнай партыі — завяванне ўлады. Таму ўносяцца прапановы ў раздзел Канстытуцыі, які датычыцца гэтага аспекту.

Дзмітрый Шаўцоў: Накідаць тэзісы на дыялогавай пляцоўцы проста, але тэхнічна забяспечыць іх рэалізацыю вельмі складана. На дыялогавай пляцоўцы, дзе ўдзельнічаў я, доўга абмяркоўвалі пераход ад мажарытарнай сістэмы да прапарцыянальнай, змешанай. Калі пераходзіць на змешаную сістэму выбараў, трэба рабіць аднамандатныя акругі і частку ад партыйных спісаў. Як гэта зрабіць тэхнічна? 50 на 50? Робім аднапалатны парламент ці пакідаем двухпалатны? Як будуць у кожную з палат выбірацца парламентарыі? Калі кажам пра 110 акруг, дэпутатаў будзе 220 — палову выберам мажарытарным чынам, палову — па партыйных спісах. Аднак павелічэнне колькасці дэпутатаў вядзе да павелічэння фінансавання.

Калі зменшыць колькасць дэпутатаў, павялічацца акругі. Сам я заўсёды выказваўся супраць змешанай сістэмы. Калі ў парламенце акругу прадстаўляе канкрэтны Іваноў, ён падсправаздачны сваім выбаршчыкам і прасоўвае іх інтарэсы. Калі выбіраць па партыйных спісах, там зусім іншыя механізмы. Сыход ад існуючай сістэмы мае шмат падводных камянёў...

Віктар Чайчыц: На дыялогавай пляцоўцы ў Мінгарсавеце прагучалі самыя розныя прапановы па мясцовым самакіраванні: як надаць яму больш паўнамоцтваў, аддзяліць выканаўчыя органы ад заканадаўчых. Усё быццам бы добра, але з'яўляецца пытанне: дзе на гэта ўзяць грошы? Як гэта ўсё будзе? Сёння перыяд, калі мы напрацоўваем данныя, як студэнты перад сесіяй. Атрымліваем інфармацыю, а потым наступае час, калі неабходна ўсё раскласці па палічках.

Ёсць прапановы, якія, на думку тых, хто прапануе, датычацца толькі Канстытуцыі. Канстытуцыйны суд, напрыклад, кажа пра замацаванне яго паўнамоцтваў і статусу ў асобным артыкуле. Узнікаюць пытанні адносна таго, хто з'яўляецца суб'ектам звароту ў Канстытуцыйны суд. Сёння Канстытуцыйны суд актыўна займаецца змяненнямі і ўжо прапрацаваў шмат Канстытуцый іншых краін, каб узяць адтуль лепшае.

«Прыняццем новай Канстытуцыі праблемы не вырашацца. Недарэмна ж існуе паняцце дэкларатыўнай Канстытуцыі. Зрабі яе хоць «залатую», але калі ў грамадстве не будзе нічога змяняцца, яна не будзе працаваць. Сёння пытанне не толькі ў Асноўным Законе, а ў тым, як будуць змяняцца кіраванне, эканоміка, сацыяльная сфера, ахова здароўя, адукацыя і іншае».

У грамадзян узнікае пытанне аб судзе прысяжных, гэта таксама неабходна абазначыць. Без Канстытуцыі нельга будзе прапісаць у Крымінальным ці Крымінальна-выканаўчым кодэксе: калі абвінавачаны не давярае суду, ён мае права склікаць суд прысяжных. Дадам, што суд прысяжных — вельмі аўтарытэтны орган, які вымагае велізарных расходаў.

На дадзены момант грамадства ў нас актыўнае. Кожны чалавек хоча, каб ад яго нешта залежала. Калі людзі ўносяць прапановы — значыць, вераць, што іх пачуюць. Ёсць давер, галоўнае — яго не страціць.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

З нагоды

ПЛЯЦОЎКА МАГЧЫМАСЦЯЎ

У Мінску з 10 да 13 лістапада пройдзе 26-я Міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Прадэкспа-2020». У праграме — прэзентацыі, форумы, майстар-класы, інтэрактыўныя шоу.

Фота БЕЛТА.

— Гэтае мерапрыемства мае вялікае значэнне ва ўмовах пандэміі і глабальнай перабудовы ўсіх бізнес-працэсаў, рэзка зменлівага асяроддзя, звязанага з ізаляцыяй грамадства і бізнесу ў многіх краінах. Зараз асабліва важна не страціць рынак збыту прадукцыі. Каб гэтага не адбылося, трэба заставацца ў кантакце з мэтавай аўдыторыяй, своечасова рэагаваць на патрабаванні рынку, мець паразуменне з партнёрамі для сумеснага пераадолення складаных сітуацый. Таму мы прадугледзелі некалькі фарматаў удзелу ў «Прадэкспа», у тым ліку ў рэжыме анлайн, — расказаў **начальнік упраўлення выставак і кірмашоў выставачнага цэнтра «БелЭкспа» Аляксандр ЗДОБНІКАЎ.**

Спецыяліст адзначыў, што з улікам эпідэміялагічнай сітуацыі падчас мерапрыемства будуць прынятыя меры для недапушчэння распаўсюджвання каранавіруса. «Прадугледжаны шматлікія вільготныя прыборкі, бескантактавыя вымяральні тэмпературы, масачны і пальчатачныя рэжымы. Мы будзем кантраляваць, каб гэта выконвалі ўсе ўдзельнікі. Да таго ж выстаўка-кірмаш арганізавана такім чынам, каб абмежаванне масавасці не паўплывала на эфектыўнасць яе правядзення».

Начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Аляксей БАГДАНАЎ звярнуў увагу, што на пляцоўцы збярэцца больш чым 80 удзельнікаў са сваімі экспазіцыямі, якія прадстаўляць мясную, малочную, перапрацоўчую і іншыя галіны харчовай індустрыі.

— Будзе прадстаўлены шэраг навінак. Пройдзе дзелавы форум «Стратэгічныя перспектывы развіцця харчовай прамысловасці Беларусі», які збярэ прадстаўнікоў зацікаўленых ведамстваў, органаў дзяржкіравання, кіраўнікоў вядучых прадпрыемстваў харчовай сферы і іншых, яны раскажуць пра тэндэнцыі ў сферы на найбліжэйшую будучыню. Таксама пройдзе кангрэс вытворцаў і гандлёвых сетак, на які мы запрасілі кіраўнікоў буйных і малых гандлёвых прадпрыемстваў з усёй краіны, што супрацоўнічаюць з беларускімі вытворцамі. Галоўныя пытанні, якія будуць абмяркоўвацца ў яго рамках, — актуальныя метады прасоўвання беларускіх тавараў на рынку, сусветныя тэндэнцыі ў сферы і іншыя.

«Прадэкспа» — адна з найбуйнейшых выставак у краіне. Традыцыйная падзея спрыяе актыўнаму супрацоўніцтву вытворцаў, пакупнікоў, гандлёвых сетак, наладжванню карысных кантактаў, прасоўванню новых гандлёвых марак, продажу харчовай прадукцыі, і, што галоўнае, павышэнню канкурэнтаздольнасці беларускіх прадуктаў харчавання ў міжнародным фармаце.

Намеснік старшыні праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў «Белкаапсаюз» Інеса КАРАТКЕВІЧ расказала, што падчас выстаўкі на іх стэндзе будзе прадстаўлена харчовая прадукцыя больш чым 300 прамысловых прадпрыемстваў. «Разглядаем гэтую пляцоўку як магчымасць для адкрытага дыялогу з аўдыторыяй, нацэлены на прасоўванне якасных беларускіх тавараў. Мы прадэманструем нашы навінкі, якіх толькі сёлета за 211. Большасць з іх накіравана на здаровае харчаванне, з павялічанай доляй выкарыстання натуральнай айчыннай сыравіны».

Усе наведвальнікі выстаўкі-кірмашу таксама змогуць паназіраць за кулінарным Кубкам, прафесійным форумам хлебапёкаў і кандытараў «Міжнародны хлебны салон», прыняць удзел у розных дэгустацыйных конкурсах і шоу. Пра некаторыя са «смачных» конкурсаў расказала **намеснік старшыні Федэрацыі шэф-кухараў і кандытараў, галоўны рэдактар часопіса «Пекар і кандытар» Людміла АЎСЯННІКАВА:**

— Сёлета будзе прадстаўлены традыцыйны Чэмпіянат кандытарскага мастацтва па 13 намінацыях, у ім паўдзельнічаюць як прафесійныя кандытары, якія не раз прадстаўлялі нашу краіну на Сусветных кулінарных конкурсах, так і выкладчыкі розных устаноў адукацыі. Таксама пройдзе конкурс «Беларусь шакаладная», у ім прымуць удзел адны з самых моцных беларускіх шакалацье. Яны створаць шакаладны 3D-торт, шакаладныя ўпрыгажэнні і дэсерты. Іх прадэманструюць мадэлі Нацыянальнай школы прыгажосці на афіцыйнай цырымоніі адкрыцця выстаўкі ў 14 гадзін. Таксама будзе прадстаўлена шырокая праграма майстар-класаў: росліс карцін шакаладам, гатаванне нізкакаларыйных труфеляў і іншае.

Нагадаем, выстаўка-кірмаш «Прадэкспа» пройдзе ў выставачным комплексе «БелЭкспа». Наведаць яе можна як па папярэдняй рэгістрацыі, так і па квітку, які можна набыць на ўваходзе пляцоўкі, яго кошт — 10 рублёў.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

«Гэты год вельмі цяжкі для сістэмы аховы здароўя»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Раскажыце, калі ласка, пра асноўныя метадалагічныя рэкамендацыі, якія санітарная служба распрацавала для школ.

К. С.: — Яны падрыхтаваны з мэтай папярэджання распаўсюджвання інфекцыі COVID-19 ва ўстановах адукацыі Беларусі ў 2020/2021 навучальным годзе. На іх аснове, а таксама ўлічваючы ўказанні і планы выканаўчых і распарадчых органаў, у кожнай установе з улікам яе тыпу і ўмоў, асаблівасцяў рэжыму дзейнасці распрацоўваецца «План арганізацыйных і санітарна-супрацьэпідэміялагічных мерапрыемстваў па папярэджанні ўзнікнення і распаўсюджвання інфекцыі COVID-19, дзеянняў пры выяўленні інфекцыі COVID-19», які зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі.

«Дырэктар можа звярнуцца ва ўпраўленне адукацыі і хадайнічаць, скажам, аб пераводзе на дыстанцыйнае навучанне старэйшых класаў, калі там хварэюць вучні. Але гэта ўнутраныя пытанні ўстаноў адукацыі. Таксама ўводзіць дадатковыя супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы звыш устаноўленых санітарных нормаў і правіл можа раённы выканаўчы камітэт».

Асноўныя рэкамендацыі такія: захаванне мер сацыяльнага дыстанцыявання, правіл асабістай гігіены (мыццё рук і твару), павелічэнне працягласці перапынкаў, раздзяленне часу пачатку і заканчэння змен, пры магчымасці пераход на двухзменны рэжым пры адназменным, наведванне сталовай па максімальна размежаваным графіку, забеспячэнне работы кур'ерскай службы і прыём карэспандэнцыі бескантактавым спосабам, абмежаванне ў залежнасці ад інтэнсіўнасці развіцця эпідэміялагічнага працэсу правядзення спартыўных, культурна-масавых і іншых відовішчных мерапрыемстваў, абмежаванне ўваходу ва ўстанову. Таксама павінны быць створаны ўмовы для арганізацыі «прапускнога фільтру» для работнікаў, забяспечаны належны санітарны стан памяшканняў, вільготная прыборка з выкарыстаннем дазволеных для гэтых мэт дэзінфікуючых сродкаў. Работнікі мусяць выкарыстоўваць індывідуальныя сродкі аховы органаў дыхання. Пры адсутнасці медыцынскага ізалятара павінна быць вызначана памяшканне, якое можа выкарыстоўвацца для часовай ізаляцыі навучэнцаў ці работнікаў з прыкметамі вострай рэспіраторнай інфекцыі.

— Пры якіх умовах клас закрываюць на каранцін?



А. Г.: — Каранцін — гэта больш абывацельскі тэрмін. Мы ў сваім асяроддзі выкарыстоўваем такое паняцце, як увядзенне супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. І тое, што цяпер адбываецца ў нашай краіне, гэта якраз супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы. Меры, звязаныя з роспускам класа, уводзяцца, згодна з дзеючым заканадаўствам, калі ў наяўнасці не менш за 30 % захварэлых з прычыны, як правіла, ВРВІ ці грыпу. Такой колькасці цяпер няма і амаль не бывае. Калі паглыбляцца ў эпідэміялагічнае расследаванне, то высвятляецца, што вучні адсутнічаюць не толькі ў сувязі з хваробай: захварэў аднакласнік, і маці вырашыла пакінуць дзіця дома. Тут мае значэнне не колькасць адсутных на занятках, а менавіта хворых, якія маюць адпаведнае медыцынскае заключэнне.

— Калі клас усё ж распускаюць, усім вучням павінны зрабіць тэсты на COVID-19?

А. Г.: — Не. Лабараторнае даследаванне (ПЛР ці экспрэс-тэсты) праводзяцца тады, калі маецца клінічная карціна захворвання або чалавек з'яўляецца кантактам першага ўзроўню. І тут яшчэ важна, як даўно адбыўся кантакт з хворым.

— Хто прымае рашэнне, напрыклад, аб пераводзе класа на дыстанцыйнае навучанне?

А. Г.: — Мы бачым і ацэньваем неспрыяльную сітуацыю, даём рэкамендацыі, у тым ліку дырэктару навучальнай установы. Напрыклад, мінімізаваць перамяшчэнні дзяцей з кабінета ў кабінет. Такім чынам, клас вучыцца ў адным памяшканні, да іх прыходзяць настаўнікі, вызваляецца дадатковы час на праветрыванне і дэзінфекцыю. Мы рэкамендуем, а ўпраўленне адукацыі можа замацаваць такія меры сваім загадам, калі ў той ці іншай школе маюцца для гэтага ўмовы. Дырэктар можа звярнуцца ва ўпраўленне адукацыі і хадайнічаць, скажам, аб пераводзе на дыстанцыйнае навучанне старэйшых класаў, калі там хварэюць вучні. Але гэта ўнутраныя пытанні ўстаноў адукацыі. Таксама ўводзіць дадатковыя супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы звыш устаноўленых санітарных нормаў і правіл можа раённы выканаўчы камітэт.

— Ці абавязаны школьнікі і настаўнікі насіць маскі?

К. С.: — Маскі і пальчаткі выкарыстоўваюць медыцынскія і іншыя работнікі, задзейнічаныя ў рабоце «прапускнога фільтра». Вучні, старэйшыя за 14 гадоў, могуць насіць сродкі аховы органаў дыхання па жаданні.

— У якіх выпадках школьніку робяць тэст?

А. Г.: — Калі ён захварэў і маецца клінічная карціна COVID-19, ці стаў кантактам першага ўзроўню.

— Калі бацькі жадаюць зрабіць дзіцяці экспрэс-тэст на платнай аснове, ці ёсць такая магчымасць?

А. Г.: — Яго можна зрабіць у тых установах аховы здароўя, якія аказваюць такія паслугі. Наколькі мне вядома, некаторыя прыватныя медыцынскія цэнтры робяць платную ПЛР-дыягностыку. Але тут важна ацэньваць мэтазгоднасць гэтай працэдуры. Па інтэрпрэтацыю вынікаў варта ўсё роўна звяртацца да спецыяліста. Нават станоўчы вынік ПЛР-дыягностыкі пры адсутнасці клінічных праяў не сведчыць, што чалавек хворы і з'яўляецца крыніцай інфекцыі. Гэта могуць быць абломкі РНК-віруса, доза якіх настолькі мізэрная, што не можа выклікаць захворванне.

Напрыклад, у тых жа экспрэс-тэстах наяўнасць імуноглабуліну М неабавязкова сведчыць пра тое, што чалавек цяпер хворы ў вострай фазе. Імаверна, імуноглабуліны М не паспелі сфарміравацца ў імуноглабуліны J. Таму не варта паддавацца паніцы і бяздумна рабіць тэсты па шмат разоў.

— Цяпер з улікам інтэнсіўнай работы лабараторый колькі хутка можна атрымаць вынік ПЛР-тэста?

— Лабараторыя праводзіць тэсціраванне па двух кірунках: захварэлых і кантактаў першага ўзроўню (гэта бюджэтныя віды даследаванняў) і тых, хто выязджае за мяжу, дзе патрабуюць дакумент аб адсутнасці каранавіруснай інфекцыі (гэта робіцца на пазабюджэтнай аснове). Вясной працавалі ў кругласутачным рэжыме. Цяпер пакуль такой неабходнасці няма, лабараторыі спрацоўваюцца. Вынік мы паведамляем цягам 1-2 дзён.

— Колькі лабараторый працуе ў Мінскай вобласці?

— Чатыры на базе цэнтраў гігіены і эпідэміялогіі — па адной у Мінску і Ратамцы, а таксама ў Салігорскім і Барысаўскім занальных цэнтрах плюс у Мінскай абласной бальніцы. Пры неабходнасці нам дапамагае Міністэрства аховы здароўя, падключаюцца РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі і Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

— Колькі мусяць цяпер знаходзіцца на самаізаляцыі кантакты першага ўзроўню?

А. Г.: — У залежнасці ад выніку лабараторнага даследавання і клінічных праяў. Калі вынік ПЛР-даследавання ці экспрэс-тэста адмоўны і адсутнічаюць клінічныя праявы, то 10 дзён. Калі тэст станоўчы, але адсутнічае клінічная карціна, то 14. Пры станоўчым тэсце і сімптомах хваробы — да знікнення клінічных праяў і выздараўлення пацыента.

— Цяпер паўторны мазок пры выздараўленні не бяруць?

А. Г.: — Назапашаны вопыт паказаў, што мэтазгодна лабараторнае тэсціраванне праводзіць аднаразова, прычым аналіз бяруць да сёмага дня з моманту кантактавання ці ўзнікнення сімптомаў.

«Меры, звязаныя з роспускам класа, уводзяцца, згодна з дзеючым заканадаўствам, калі ў наяўнасці не менш за 30 % захварэлых з прычыны, як правіла, ВРВІ ці грыпу. Такой колькасці цяпер няма і амаль не бывае».

— Ці правяраюць цяпер знаходжанне на самаізаляцыі?

А. Г.: — Безумоўна, гэта знаходзіцца ў межах кампетэнцыі Міністэрства ўнутраных спраў, куды мы накіроўваем спісы грамадзян, якім неабходна знаходзіцца на самаізаляцыі.

— Якія асаблівасці другой хвалі COVID-19?

А. Г.: — Яна адрозніваецца не столькі цячэннем захворвання, колькі адсутнасцю насцярожанасці сярод насельніцтва. Усе стаміліся і расслабіліся, перасталі насіць маскі, апрацоўваць рукі і клапаціцца аб сацыяльнай дыстанцыі. У грамадскім транспарце лічаныя асобы ў масках. Пры наяўнасці ў агульнадаступных месцах антысептыкаў карыстанне імі цяпер — даволі рэдкая з'ява. У мяне гэта выклікае неразуменне, тым больш што ўсе ведаюць, што ў асенне-зімовы перыяд назіраецца рост іншых ВРВІ.

— У які момант вы адчулі напружанне ад надыходу другой хвалі?

— Трэба адзначыць, што санітарна-эпідэміялагічная служба ў цэлым сёлета працуе даволі напружана. Канешне, летам было менш шпіталізаваных пацыентаў, але лабараторыя тэсціравала тых, хто выязджаў на адпачынак, праводзіліся супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы ў дзіцячых лагерах. Увогуле, гэты год вельмі цяжкі для ўсіх нас, і хочацца спадзявацца, што праз нейкі час мы выдыхнем з палёгкай, як і ўся сістэма аховы здароўя, якая цяпер інтэнсіўна працуе ў надзвычайных умовах.

Алена КРАВЕЦ.

Небяспечныя «гульні»

ДЫНАМІКА — НА СКАРАЧЭННЕ

Каля 13 тысяч чалавек у нашай краіне сёння знаходзіцца на наркалагічным уліку, што на некалькі тысяч менш, чым у мінулым годзе

Аб гэтым расказала намеснік начальніка ўпраўлення галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Кацярына ШЭЛЕГАВА.

— Эпідэміялагічная сітуацыя аказала ўплыў і на сітуацыю з распаўсюджваннем наркотыкаў. Цяпер наркадылерам значна складаней правезці наркотыкі на тэрыторыю краіны, але такія спробы ёсць. Нядаўна (22—23 кастрычніка. — **Аўт.**) у Расонскім і Полацкім раёнах затрыманы ўдзельнікі злачыннай групы, якія перапраўлялі мефедрон. Яшчэ адзін новы спосаб перасылкі наркатычных рэчываў — праз паштовыя адпраўленні, сёлета такіх было выяўлена 51. Гэта былі як псіхатропныя рэчывы, так і лекавыя прэпараты, якія іх змяшчаюць. Яны адпраўляліся з Германіі, Ізраіля, ЗША і Украіны. Усяго ў гэтым годзе выяўлена 22 каналы паставак наркотыкаў.

Кацярына Шэлегава адзначыла, што ў краіне зменшылася колькасць канфіскаваных наркатычных рэчываў. Па звестках дзяржаўнай статыстыкі, у бягучым годзе канфіскавана 80 кг наркатычных сродкаў і 20 кг псіхатропных рэчываў. Да таго ж у апошні час праяўляецца тэндэнцыя да змены асартыменту прапануемых на рынку забароненых рэчываў: з сярэдзіны мінулага года праваахоўнікі назіраюць з'яўленне такіх наркотыкаў, як метадон і гераін. У канцы 2019 года, напрыклад, была выяўлена буйная партыя гераіну, — канфіскавана больш за 500 кілаграмаў.

— Са з'яўленнем на рынку метадону ў больш чыстым выглядзе пачала расці колькасць смяротных выпадкаў. Павялічылася колькасць перадазіровак сярод даросłага насельніцтва. Што датычыцца непаўналетніх, з 2014 года смяротных зыходаў, звязаных з перадазіроўкай наркотыкаў, у краіне зарэгістравана не было. Сёлета ў арганізацыі аховы здароўя з вострым атручэннем наркатычнымі рэчывамі паступілі толькі два падлеткі з Гомельскай вобласці. Таксама важна, што колькасць нарказлачынстваў, учыненых непаўналетнімі з 2015 года, скарацілася ў 11 разоў, колькасць дзяцей, прыцягнутых да крымінальнай адказнасці, — у 10,5 раза. Калі мы казалі пра 400 злачынстваў у 2015 годзе, то на сёння непаўналетнімі ўчынена 36 злачынстваў, прыцягнуты да адказнасці 27 асоб, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту.

Выпрацаваны метады і падыходы, якія ўжо пачалі прыносіць свае, прычым значныя, вынікі, звярнула ўвагу Кацярына Шэлегава: «Самы эфектыўны метад работы з падлеткамі — праз антынаркатычныя пляцоўкі. Яны створаны практычна ва ўсіх рэгіёнах, найбольш паспяховая — у Брэсцкай вобласці, якая функцыяне на базе Брэсцкага абласнога цэнтра эпідэміялогіі, гігіены і грамадскага здароўя. Там з дзецьмі праводзіцца комплексная работа па многіх кірунках з прыцягненнем розных спецыялістаў».

Вялікая ўвага надаецца і медыцынскай рэабілітацыі пацыентаў з залежнасцю ад псіхатропных і наркатычных рэчываў. Аддзяленні наркалагічнага профілю арганізаваны на базе ўсіх абласных цэнтраў псіхіятрыі і наркалогіі. А ў мінулым годзе на базе РНПЦ псіхічнага здароўя быў створаны эксперыментальны цэнтр для рэабілітацыі нарказалежных — сёння там атрымалі дапамогу 32 чалавекі.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

СЛУЦКІ РАЁН:

ЗЯМЛІ НАДЗЕЙНАЯ АПОРА

Спецвыпуск да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці

НАШЧАДКІ ДРЫГАВІЧОЎ ПРАЦАВАЦЬ УМЕЮЦЬ

Случчына заўсёды паказвала прыклад умелага гаспадарання на зямлі. Сёння «Звязда» — у гасцях у работнікаў аграпрамысловага комплексу раёна. Нашы карэспандэнты гутараць са старшынёй Слуцкага райвыканкама Андрэем ЯНЧЭЎСКІМ.

— Андрэй Уладзіслававіч, для пачатку, калі ласка, — які ён, ураджай-2020?

— Я агучу лічбы, а вы мяркуйце самі. Згодна з папярэднімі вынікамі мы намалацілі больш за 166 тысяч тон збожжавых, а гэта плюс 23 тысячы тон да мінулага года. Пры ўраджайнасці 45,7 цэнтнера з гектара. І такім чынам дабавілі па шэсць цэнтнераў на гектар. Сказаць, што рэкордны вынік, — не скажаш, але ён большы за сярэдні па гадах за апошні час.

Зараз ідзе ўборка бульбы, цукровых буракоў, кукурузы на сілас і на зерне. (З Андрэем Уладзіслававічам мы сустракаліся 6 кастрычніка. — **Аўт.**) Вынікі таксама вышэйшыя за леташнія — ад 10 да 15 працэнтаў у залежнасці ад культуры.

У поўным аб'ёме нарыхтаваны сянаж, хутка завершым закладваць сілас, і паўтарагадавы запас кармоў будзе забяспечаны, нягледзячы на тое што ў нас самае вялікае пагалоўе жывёлы ў вобласці і дастаткова высокая яго шчыльнасць. Маем больш за 85 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, з іх каля 30 тысяч кароў. Летам прадавалі ў дзень больш за 500 тон малака, зараз прадаём недзе 460 тон. Як 5-6 невялікіх раёнаў разам.

Але і гэта не галоўнае, мы зараз адыходзім ад лічбаў, якія 6 цудоўныя яны ні былі, глядзім эканоміку. І ў нас пяць з 17 гаспадарак цвёрда стаяць на нагах, яны цалкам на сваіх грашах, ідзе планамернае развіццё, людзі атрымліваюць зарплату больш за тысячу рублёў. Гэта ДП «Саўгас «Рачкавічы» Беларускай чыгункі», ААТ «Вітка-Агра», ААТ «Падлессе-2003», аграфірма «Лучнікі», сельскагаспадарчы філіял Слуцкага сыраробнага камбіната — самая моцная па вытворчасці малака гаспадарка. Яна адна прадае 75 тон, зноў жа як цэлы раён. І эканоміка складваецца найлепшым чынам.

Сем гаспадарак можна назваць моцнымі сераднякамі. І дзве гаспадаркі крыху слабейшыя, але і там страт за дзевяць месяцаў не маем. Па годзе па Слуцкім раёне стратных гаспадарак не будзе.

— Раскажыце, калі ласка, пра кіраўніцтва рэальным сектарам з боку райвыканкама.

— Мы лічым, што ў большай ступені павінны клапаціцца пра сацыяльную сферу раёна. Але яна вырастае з вынікаў работы рэальнага сектара, адкуль бяром грошы на далейшае развіццё сацыяльнай сферы. І заканамерным становіцца клопат пра эфектыўнасць вытворчых калектываў. У нас крыху іншая, свая структура прадпрыемстваў, бо раён — аграрны дзякуючы цудоўнай, багатай зямлі. Самыя буйныя нашы прадпрыемствы заняты перапрацоўкай прадукцыі палёў і фермаў. Усе яны, за выключэннем воцатнага завода, з'яўляюцца ўласнасцю Мінскай вобласці. На гэтых прадпрыемствах ёсць наша доля, і прадстаўнікі дзяржавы ўдзельнічаюць у іх жыцці. Калі вынікі работы вымушаюць жадаць лепшага, заслухоўваем на выканкаме і сумесна з уласнікамі прымаем меры.

Астатнія прадпрыемствы — гэта малы бізнес, там форма ўласнасці прыватная. Стараемся ім дапамагаць і асабліва не перашкаджаць.

А сацыяльнай сферай мы непасрэдна кіруем.

— Некаторы час таму вы бралі курс на стварэнне аграпрамысловых холдынгаў...

— Там, дзе бачым у гэтым неабходнасць, ідзём на ўзбуйненне. Лічым яго аптымізацыяй. Хутка «Вітка-Агра» аб'яднаецца з эксперыментальнай базай «Танежыцы», да новага года будзем мець адзіную гаспадарку. Спадзяюся, вельмі моцную. Нам бачыцца, што будучае за такімі інтэграцыйнымі структурамі, у якіх магчыма канцэнтрацыя рэсурсаў. Зноў жа таму, што на першы план усё больш рашуча выходзіць эканоміка. Не выключана, што ў будучым Слуцкі раён паглыне існуючыя інтэграваныя структуры і будзе ўяўляць сабой адзіны буйны холдынг.

— Шырока вядомы брэнд — «Слуцкія паясы». Ці ўдаецца раскручваць яго сёння, выпускаючы сувенірную прадукцыю на экспарт? І якая прадукцыя мясцовых прамысловых прадпрыемстваў заваявала такую ж славу?

— Час цяпер іншы. Продаж саміх паясоў і прадукцыі з іх упаў, бо на першы план выходзяць некалькі іншых патрэбаў. І запыт на такія дарагія сувеніры як унутры краіны, так і за яе межамі нашмат зменшыўся. Фабрыка мусіць перастройвацца на іншыя віды прадукцыі: цяпер разыходзяцца коўдры, падушкі — тое, што больш патрэбна для жыцця. За кошт гэтага пакуль прадпрыемства выжывае, хоць сітуацыя складаная. Патрэбна далей і больш рашуча перастройвацца, шукаць новыя нішы на рынку. І больш эфектыўна гандляваць.

А калі працягваць тэму брэнда, то нават на сусветных рынках заваявала аўтарытэт прадукцыя харчовай прамысловасці раёна. У шэрагу перадавых выдзяляецца сыраробны камбінат, ён развіваецца і ідзе, бадай што, услед за «Савушкіным прадуктам». І па аб'ёмах вытворчасці, і па якасці прадукцыі, па прыбыткоўвасці. Цяпер там маладая каманда, усе яе члены — высокапрафесійныя спецыялісты, таму ўскладаем на іх вялікія надзеі.

❍ Прадстаўляем суразмоўніка

Андрэй Уладзіслававіч родам з Астраўца. Закончыў Гродзенскі аграрны ўніверсітэт з дыпломам агранома, Акадэмію дзяржаўнага кіравання.

Працоўная біяграфія пачыналася ў родным раёне на розных пасадах, у тым ліку галоўнага агранома і намесніка кіраўніка СВК. Ва ўзросце 24 гадоў быў прызначаны на пасаду старшыні аднаго з СВК, а пазней прыняў самую буйную гаспадарку раёна — СВК «Гервяты». Праз чатыры гады стаў начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі Астравецкага райвыканкама.

У Слуцкім раёне — з 2014 года. Калі атрымаў прапанову — сумненняў было многа. Але не пашкадаваў аб гэтым ні разу, як бы цяжка ні было. Набыты вопыт лічыць цудоўнай школай жыцця.

Разам з жонкай выхоўвае траіх дзяцей. Пры ўсёй занятасці па рабоце і сямейнымі клопатамі знаходзіць час і для любімых рыбалкі і палявання. Два разы на тыдзень — валейбол, ёсць каманда. Удзельнічаў у міжраённых чэмпіянатах па гульні «Што? Дзе? Калі?». Спадзяецца, што інтэлектуальныя гульні будуць адноўлены пасля пандэміі.

Найлепшае з айчынных цукровых прадпрыемстваў і па тэхнічнай аснашчанасці, і па эканоміцы — наша. На постсавецкай прасторы яго таксама прызнаюць найлепшым цукровым заводам. Сёння цукрова-рафінадны камбінат адзін працуе з прыбыткам сярод чатырох аднатыпных калектываў краіны, нягледзячы на тое што апошнія паўгода цэны на цукар былі надзвычай нізкія. Зараз яны выраслі, і камбінат пачаў атрымліваць чысты прыбытак. Спрыяе і тое, што тут пабудаваны спецыяльныя ёмістасці для захоўвання сіропу, і ў разгар сезона завод не толькі выпускае асноўны прадукт, але і запасаецца сіропам з цукровых буракоў. Яго перапрацоўваюць у цукар у міжсезонне.

У апошнія гады плюсуе камбінат хлебапрадуктаў, гаспадаркі сыравіннай зоны павышаюць ураджаі і больш пастаўляюць яму зерня. Сёння тут пачалі выпускаць амаль усе віды круп. На рынкі цяпер выходзіць Беларуская біятэхналагічная карпарацыя, яна таксама выпускае камбікармы, і трэба так наладзіць сваю работу, каб не быць канкурэнтамі. Столькі камбікорму, як раней, прадаваць ужо не атрымаецца. Плануем перадаць камбінату хлебапрадуктаў свінаводчыя комплексы, яшчэ некалькі гаспадарак, каб ён сам вырошчваў сабе больш таннага зерня, атрымліваў танную свініну і мог выйсці на рынкі з іншым сваім прадуктам. Такім чынам зможам захаваць прадпрыемства і калектыў.

— Што ў раёна зараз адметнае ў сацыяльнай сферы?

— Працягваецца будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў, традыцыйна віруе культурнае жыццё. Але мы схільныя больш гаварыць аб праблемах. Галоўная з іх — дэмаграфічная, штогод у нас, асабліва ў раёне, становіцца на 300, а то і на 400 чалавек менш. Па-першае, у вёсцы няма столькі рабочых месцаў. Па-другое, ідзе аб'ектыўны працэс. Горад пакуль трымае сваю планку — каля 64 тысяч жыхароў. І ў апошнія два гады насельніцтва становіцца менш прыкладна на 100 чалавек. Адчулі гэтую тэндэнцыю пасля таго, як здалі новую дарогу на Мінск і пайшоў адток насельніцтва і з горада.

Змагаемся з COVID-19. Апрацоўваем пад'езды жылых дамоў і лесвічныя пляцоўкі, прыпынкі грамадскага транспарту. Яшчэ ў пачатку пандэміі правялі кісларод ва ўсе аддзяленні раённай бальніцы, і ён спатрэбіўся нам ужо праз месяц. Тады ж пачалі адкрываць аддзяленні — адно, другое, трэцяе. Калі б не зрабілі гэтага своечасова, маглі быць сур'ёзныя пытанні. Зараз пачалася другая хваля, зноў запаўняем аддзяленні. Акрамя таго, па прапанове галоўнага ўрача раёна і з удзелам выканкама стварылі базу для аказання аператыўнай дапамогі людзям па месцы пражывання: прадпрыемствы выдзелілі транспарт, спецыяльныя касцюмы, шчыткі, маскі, кіслародныя балоны, і з такім аснашчэннем медработнікі ў выпадку неабходнасці змогуць выязджаць для аказання мабільнай дапамогі, у тым ліку кіслародам. Усяго будзе 50 адзінак тэхнікі і 50 балонаў.

Вось чым сёння мы актыўна займаемся. Таксама турбуемся пра школы, дзіцячыя садкі, пра іх рамонт. За апошнія гады шмат зрабілі спартыўных залаў, людзі ацэньваюць станоўча. Ды і сам я як бацька магу толькі радавацца, калі ў школах утульна і талкова. У сацыяльнай сферы наогул нармальна развіваемся, толькі марудней, чым хацелася б, бо на ўсё пакуль не хапае грошай. Праўда, тэмпы будаўніцтва раскруцілі сёлета так, што адны з нямногіх выканаем план па першачарговым забеспячэнні шматдзетных сем'яў жыллём. Сёлета забяспечым каля 250 сем'яў. Так што ў асноўным пытанне вырашаецца. Плюс будуем сацыяльнае і арэнднае жыллё.

Яшчэ адзін цікавы праект — агульнагарадскі культурны цэнтр на тэрыторыі былога кансервавага завода, з амфітэатрам і пешаходнай зонай. Будзе завершана рэканструкцыя краязнаўчага музея.

Культурны ўзровень Случчыны заўсёды быў дастойны, культурныя традыцыі — багатыя, нягледзячы на тое што матэрыяльная база магла быць і больш развітай. Але ўжо зараз тыя ж нумары мастацкай самадзейнасці нашых аматарскіх калектываў пераўзыходзяць многіх суседзяў па майстэрстве, па разнастайнасці. Што прыносіць перамогі як на абласных, так і на рэспубліканскіх конкурсах. А гэта, згадзіцеся, паказальна.

«Напярэдадні прафесійнага свята работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці, якое мы ўсе разам будзем адзначаць 15 лістапада, — сказаў у заключэнне Андрэй Янчэўскі, — вінушую працаўнікоў галіны і шчыра жадаю поспехаў, здароўя, міру і згоды ў сем'ях і грамадстве. Каб у Слуцку і надалей было ўсё па-людску».

Гутарыў
Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Дырэктар ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» — Дзяніс ВАСЬКО.

«Белае золата»

Слуцкага сыраробнага камбіната,

які радуе спажыўцоў усё новай прадукцыяй

Ясь Белавус — беларусам

Маркетолагі Дзіяна КОРШАК, Юлія КАРТЭЛЬ, Наталля ТУРАВЕЦ.

Адлік сваёй гісторыі ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» вядзе з 1935 года, калі быў здадзены ў эксплуатацыю масласырзавод. На той час тут працавала 35 рабочых, а праектныя магутнасці па перапрацоўцы малака складалі 2000 тон у год. Як высокапрадукцыйнае малакаперапрацоўчае прадпрыемства дзяржаўнага ўзроўню Слуцкі сыраробны камбінат быў уведзены ў дзеянне ў 1981 годзе. Гэта сучаснае прадпрыемства па перапрацоўцы «белага золата» адно з найбуйнейшых сярод аналагічных прадпрыемстваў не толькі ў Мінскай вобласці, але і ў краіне. На сённяшні дзень сыраробны камбінат — гэта ўніверсальная кампанія, куды ўваходзяць Салігорскі, Клецкі, Капыльскі, Любанскі філіялы, а таксама Уздзенскі, Старадарожскі, Пухавіцкі вытворчыя ўчасткі. Калектыў налічвае больш як 3700 чалавек і перапрацоўвае да 2 тысяч тон малака ў суткі. Прадукцыя ідзе пад гандлёвымі маркамі «Complimilk», «Клецкая крыначка», «Пяшчотная каралева», «Плаўгорад».

Камбінат прапаноўвае спажыўцам шырокі асартымент прадукцыі: сыры цвёрдыя і паўцвёрдыя, сыры плаўленыя каўбасныя вэнджаныя і нявэнджаныя, маянэз, марожанае, сухія малочныя прадукты, масла. Асартымент прадукцыі з кожным годам пашыраецца. Сёлета выпусцілі лінейку прадуктаў пад новым брэндам — «Ясь Белавус». Напрыклад, сыр «Бурата» — гэта спалучэнне мацарэлы і вяршкоў. Яго назва ідзе ад слова burro, што азначае «масла». Кожны шарык уяўляе сабой мяшочак з мацарэлы, напоўнены начынкай. Сыр «Рыкота» — гэта мяккі пяшчотны тварог, які нагадвае галушку, што плавае ў расоле. Гэта — традыцыйны малочны прадукт італьянскай кухні. Ён вельмі смачны і карысны для здароўя, асабліва пры захворваннях страваальнага тракта. Прадукт утрымлівае мікраэлементы, лёгказасваяльныя бялкі, вітаміны групы А, В, кальцый. Пакупнікі ацанілі не толькі смакавыя якасці новай прадукцыі, але і афармленне ўпакоўкі, на якой змешчана выява вусоў Яся Белавуса. Дарэчы, слуцкія сыраробы ўдзельнічаюць у шматлікіх конкурсах, кірмашах, конкурсах дэгустацыі, сырных фестывалях, што ладзяцца не толькі ў Мінскай вобласці, але і па ўсёй Беларусі. Сёлета восенню іх прадукцыю ацанілі на Мінскім абласным фестывалі працаўнікоў сяла «Дажынкі-2020», што прайшоў у Чэрвені. Слуцкі сыраробны камбінат арганізаваў тут сырную лаўку Яся Белавуса, дзе ўсе ахвотныя змаглі прадэгуставаць розныя віды сыроў, а таксама сыр «Адыгейскі». На камбінаце спецыяльна да свята зварылі 35-кілаграмовую галоўку «Адыгейскага». Вядома, спажыўцы цікавяцца хто такі Ясь Белавус? Некалькі стагоддзяў таму жыў чалавек з такім прозвішчам, сапраўдны аматар сыру і сыраробаў, які стварыў сырную краму. У яго было шмат паплечнікаў, якія нават арганізавалі свой тайны ордэн аматараў сыру і называлі сябе Белавусамі.

Прафесіяналы — на вагу золата

— Пра мяне не трэба нічога пісаць, — як толькі ўвайшлі ў кабінет, катэгарычна адмовіўся ад каментарыяў **генеральны дырэктар ААТ «Слуцкі сыраробны завод» Дзяніс ВАСЬКО.** — Не люблю піяру. Раскажыце лепш пра нашых людзей. Яны гэтага заслугоўваюць — шчырыя працаўнікі, прафесіяналы сваёй справы. Менавіта дзякуючы ім прадпрыемства развіваецца, крочыць наперад. Перад прафесійным святам — Днём работніка сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці хацелася б пажадаць ім і іх блізкім, родным шчасця, любові і доўгіх гадоў працы на карысць прадпрыемства. Мы падвядзём вынікі дзейнасці, павіншуем калектыў, уручым граматы і падарункі перадавікам падчас урачыстага мерапрыемства.

Сапраўды, у акцыянерным таварыстве працуюць творчыя, крэатыўныя людзі, нераўнадушныя да агульных спраў.

Людміла Мікалаеўна БУТУШЫНА — начальнік цэха натуральнамалочнай прадукцыі.

Падчас вучобы ў Слуцкім каледжы перапрацоўчай прамысловасці праходзіла на прадпрыемстве практыку. Пасля заканчэння вучобы засталася тут, завочна закончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання. Працуе на камбінаце з 1998 года, з 2001-га — начальнікам цэха.

— Усё прыходзіла з вопытам, мне пашанцавала, што трапіла ў добры калектыў, мяне вучылі, падказвалі, калі нешта не атрымлівалася. І цяпер у нас шмат моладзі, маладых спецыялістаў, якія пасля атрымання дыплома ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах застаюцца на камбінаце. За іх адказваюць майстры ўчасткаў, абучаюць практычнаму вопыту. Ёсць у нас работнікі, якія працуюць па 30 гадоў, з дня заснавання нашага цэха, — кажа суразмоўніца.

Цяпер ідзе рэканструкцыя цэха натуральнамалочнай прадукцыі. Пасля яе заканчэння будуць устаноўлены новыя лініі па разліве смятаны, кефіру, малака, што дазволіць павялічваць аб'ёмы выпуску.

Аганэс ГРЫГАРАН — інжынер па аўтаматызацыі. Кіраўніцтва прадпрыемства лічыць, што прафесіяналы такога ўзроўню — рэдкасць, яны на вагу золата. Аганэс пераехаў з маці ў Беларусь з Данецкай вобласці Украіны, дзе адбывалася агульнавядомыя падзеі. Яго матуля Карынэ па спецыяльнасці тэхнолаг. Зараз на пенсіі, працуе простым сыраробам.

Начальнік цэха натуральнамалочнай прадукцыі Людміла БУТУШЫНА (злева) кантралюе працэс вытворчасці тварагу.

Інжынер па аўтаматызацыі — Аганэс ГРЫГАРАН.

— У нас армянскія карані. У сувязі з генацыдам армянскага народа, што пражываў у Асманскай імперыі (сучасная Турцыя) у 1915 годзе, мае продкі вымушаны былі пакінуць радзіму. Частка з іх пасялілася ў сучасным Краснадарскім краі, у Данецкай вобласці. Я вельмі задаволены, што лёс прывёў мяне на Слуцкі сыраробны завод. Напачатку я прайшоў сумоўе, выпрабавальны тэрмін, а затым узялі на работу. Прынялі мяне ў калектыве прыязна. Тут працуюць вельмі нераўнадушныя да спраў прадпрыемства людзі, спакойныя, шчырыя. А што чалавеку трэба? Паважлівыя адносіны з боку іншых, любімая работа, годная зарплата і дах над галавой.

Дарэчы, Аганэсу з маці выдзелілі блок у інтэрнаце — два пакоі з усімі бытавымі выгодамі.

Як прызнаўся хлопец, ён атрымаў від на жыхарства ў Беларусі і вяртацца ў Данецкую вобласць не збіраецца. Там практычна няма работы, міздрыня заробкі, дэфіцыт прадуктаў.

Заглянулі мы і ў фірменны магазін, што знаходзіцца побач з камбінатам. Нас сустрэла **загадчыца гандлёвага аб'екта Антаніна КУНІЦА.**

— Мне падабаецца тут працаваць, калектыў дружны, ветліва ставяцца да пакупнікоў. У памяшканні заўсёды чыста, акуратна, прадстаўлены шырокі асартымент прадуктаў, камбінатам своечасова выконваюцца заяўкі, якія робім два разы на дзень. Машына завозіць усё неабходнае раніцай і пасля абеду. Вельмі добра ідуць тварог, сыры, масла.

— Тут можна набыць і суправаджальныя тавары — хлебабулачныя, кандытарскія вырабы, каўбасы, сокі, мінеральную ваду ды іншае. Гэта вельмі зручна: не трэба па дарозе да дому заходзіць у іншыя гандлёвыя пункты — усё неабходнае пад рукой, — кажа адна з пакупніц, якая пасаромелася назваць сваё прозвішча.

Агульны стаж **прадаўца шостага разраду Ірыны БОГДАН** з улікам працы на вытворчасці і ў гандлі складае 37 гадоў. Жанчына ўжо чатыры гады як на пенсіі, але яе папрасілі яшчэ папрацаваць, прадоўжылі кантракт.

Хто добра працуе, той з карысцю і адпачывае

— Нашы людзі — наш залаты фонд, — лічыць **старшыня прафсаюзнага камітэта Дзмітрый САСІНОВІЧ.** — І мы іх стараемся ва ўсім падтрымаць. На сённяшні дзень сацыяльны пакет складаецца з артыкулаў, якія прапісаны ў калектыўным дагаворы. І яны на 100 % выконваюцца. Напрыклад, пры нараджэнні дзіцяці выплачваецца 10 базавых велічынь (БВ) кожнаму з бацькоў. Тым, хто ўпершыню ўступае ў шлюб, — 10 базавых. На арганізацыю пахавання блізкіх нашага работніка — маці, сына, дачкі, бацькі — выдзяляецца 20 БВ. Шматдзетныя сем'і, адзінокія бацькі, сем'і, якія маюць дзяцей-інвалідаў, адзін раз у год атрымліваюць па пяць базавых велічынь. Пры працяглай хваробе работніка — 30 дзён і больш — пяць базавых. У сувязі са звальненнем яго па стане здароўя, інваліднасці — 10 БВ. Пры гэтым ён лічыцца нашым пенсіянерам.

Акрамя таго, кожнаму работніку, які ідзе ў адпачынак выдзяляецца матэрыяльная дапамога ў 10 базавых велічынь. Прадпрыемства аплачвае большую частку кошту пуцёўкі на аздараўленне дзяцей супрацоўнікаў, бацькі ўносяць толькі 10 % ад цаны. На Новы год дзецям да 14 гадоў уручаюцца салодкія падарункі, а таксама — усім работнікам. Ахвотным прадпрыемства аплачвае кошт медыцынскай страхоўкі.

Ну, і вядома ж, не адзінай работай жыве чалавек. Для калектыву ладзяцца шматлікія экскурсіі, спартыўныя спаборніцтвы, конкурсы. Праўда, цяпер у сувязі з каранавірусам іх паменела, або яны праводзяцца на свежым паветры з захаваннем усіх санітарных нормаў. Асабліва запомніўся конкурс «Каханне з першага погляду» па аналогіі з папулярнай у свой час тэлевізійнай гульнёй. У зале сабрался шмат гасцей. У рамантычным шоу прынялі ўдзел шэсць юнакоў і шэсць дзяўчат. Па выніках гульні супалі дзве пары. Цяпер работнікі прадпрыемства сочаць за тым, як развіваюцца паміж імі адносіны і вельмі хочуць, каб яны пабраліся шлюбам.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

УНП 600119098.

Ірына БОГДАН — прадавец 6-га разраду.

Тэхнічны прагрэс на вёсцы

НА ЧАРЗЕ — АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ

Слова — дырэктару ДП «Саўгас «Рачкавічы» Беларускай чыгункі Мікалаю КРАСУЦКАМУ:

На новым беларускім камбайне «Палессе» працуюць Міхаіл ФАНДЗЮХІН і Раман КРЫВУЛЯ.

— Калі падводзіць папярэднія вынікі, то сёлета ўраджай адносна нармальны. Збожжавых атрымалі 54,1 цэнтнера з гектара на круг. Лепш за ўсё ўрадзіла пшаніца. Ячмень даў 42,4 цэнтнера. Думаючы пра дзень заўтрашні, пасля ўборкі збожжавых пасеялі больш за 300 гектараў люцэрны. Гэта бялковая культура, бялок для жывёлы. Сянаж ад яе больш пажыўны, чым са злакавых траў. Каб было малако, патрэбна люцэрна. Поле засяваецца гэтай шматгадовай культурай на пяць гадоў, і ўвесь гэты час пры правільным доглядзе здымаем ураджай. Кукурузы сёлета пасадзілі тысячу гектараў. У нас яна родзіць добра, дае сіласу — толькі паспявай накрываць.

Дырэктар Мікалай КРАСУЦКІ на кукурузным палетку, дзе ўраджайная культура вырасла сёлета амаль на трохметровую вышыню. Дарэчы, на абласных «Дажынках» яму ўручылі медаль «За працоўныя заслугі».

Мы — дзяржаўнае прадпрыемства, і гаспадарыць стараемся па-дзяржаўнаму, эфектыўна. Калі 20 гадоў таму я прыняў гаспадарку, яна была замыкаючай у раённых зводках, фактычна па ўсіх пазіцыях. Было ў раёне 25 гаспадарак, вось і знаходзіліся на 23-м ці 24-м месцы. А зараз па жывёлагадоўлі мы за першае паўгоддзе ў рэспубліцы — 24-я арганізацыя па надоях малака. У рэс-пуб-лі-цы. Гэта само па сабе аб нечым гаворыць. У раёне — першыя па надої малака. Ужо чатыры гады штогод даём па 120 працэнтаў. Так расла вытворчасць. За пяць гадоў — у два разы. Сёння крышачку «ўпалі» з малаком, але ў любым выпадку доім 27,5 — 28 літраў малака на карову, і валавы надой наблізіўся да 43,5 тоны. Бачыце, як мы «сіганулі». Вы пытаецеся, за кошт чаго?

Тады спачатку патрэбна было падняць раслінаводства, і мы ўсё ўкладвалі ў гэтую галіну, ад якой залежыць хуткае атрыманне грошай. І паралельна пачалі займацца жывёлагадоўляй. Гэта была тая нітачка, за якую я пацягнуў як эканаміст. (Перад гэтым працаваў эканамістам і галоўным эканамістам.) Пачалі перабудоўваць усе жывёлагадоўчыя памяшканні. Ужо 15 гадоў працуюць у нас дзве брыгады з Ганцавіч — адны і тыя ж хлопцы, мы іх лічым за сваіх. Адзін год яны нам пабудавалі дзевяць сянажных траншэй. Тады ў нас быў нават праведзены рэспубліканскі семінар.

Наша задача — выйсці на 60-65 тон малака ў суткі. Усё для гэтага ёсць. У дадатак да фермаў, якія прывялі ў парадак, а рэканструкцыю іх памяшканняў мы заканчваем, засталося пабудаваць два кароўнікі і даільную залу.

Прыкметная асаблівасць наша яшчэ ў тым, што малако здаём класам «экстра». 96 працэнтаў нашага малака — класа «экстра». Калі пайшло малако хай сабе нават вышэйшага гатунку, а гэта ж таксама нармальнае малако, — для нас гэта надзвычайнае здарэнне. Даяркі атрымліваюць меншую зарплату, а некаторых адпраўляем на іншую работу. Чаму такі падыход? Бо асноўная колькасць нашага малака пастаўляецца ў Нясвіж на дзіцячае харчаванне. Яны ахвотна працуюць з намі і лічаць нас найлепшымі сваімі пастаўшчыкамі.

Так што 96 працэнтаў класа «экстра» — гэта ж салідна? Салідна. Адсюль і нашы грошы. Асноўную масу грошай дае жывёлагадоўля. Прадаём бычкоў, атрымліваем да тысячы — тысячы 200 грамаў прыбаўлення ў вазе ў суткі, а гэта дадатковыя грошы.

Немалы прыбытак дае і раслінаводства, за кошт вытворчасці харчовага зерня. У нас пшаніца харчовая трэцяга класа — клейкавіна 26-28 працэнтаў, па сваіх якасцях набліжаецца да краснадарскай. Добрыя гатункі пшаніцы — ураджайнасць добрая. Сёлета сабралі яе дзесяць тысяч тон, і ўся — трэцяга класа. У нас самы вялікі ў раёне дзяржзаказ. Мы яго выканалі, і ўсе склады, што маем, запоўнены. Гэта пры тым, што сёлета ўзведзены два новыя склады. Тысячы чатыры тон прадалі і можам яшчэ прадаваць чатыры тысячы.

Акрамя гэтага, трыста гектараў пад бульбай. На сённяшні дзень ураджайнасць — 384 цэнтнеры з гектара. Накапалі 11 тысяч 530 тон. Пакуль закладваем на захоўванне. Прадаваць будзем, як і ў мінулыя гады, у асноўным ва Украіну. А пакуль захоўванне бульбы на складах дазваляе загрузіць работай свабодныя рукі. Бо механізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці вызваляе людзей ад чарнавой работы. Калі я толькі прыйшоў сюды працаваць, у «Рачкавічах» было 60 даярак. Сёння — 12, на тры фермы. Кожны статак абслугоўвае чатыры даяркі: дзве на змене, дзве адпачываюць. Зарплата 1200—1800 рублёў у залежнасці ад таго, колькі надояць.

Займаемся і вытворчасцю кармоў. Закладваем кукурузны сілас. «Карагева палёў» урадзіла, зойдзеш — як у лес. Самыя сапраўдныя сосны. Зялёнай масы дае 483 цэнтнеры. Гэта 48 тон з гектара. І з гектара дае 89 цэнтнераў (8,9 тоны) зерня.

Купілі чэшскую плюшчылку, шмат нарыхтавалі плюшчанага зерня кукурузы і скормліваем адначасова з камбікормам, ад чаго каровы даюць вельмі добрае малако. 28 літраў малака на карову. Адсюль і рост зарплаты.

Наогул, вельмі многа купілі тэхнікі. За нябоўны год — з мінулага верасня па сёлетні май — на чатыры мільёны рублёў. Два новыя збожжавыя камбайны, КВК 8060. Купілі тэхніку для перавозкі кармоў, сеялкі — збожжавую і кукурузную, дзякуючы чаму і атрымалі шыкоўную кукурузу. Некалькі культыватараў — аж тры амкадараўскія і адзін нямецкі, плуг нямецкі, класны прычэп грузападымальнасцю 36 тон. Усё бяром у лізінг, там першапачатковы ўзнос 30 працэнтаў. Астатняе ў растэрміноўку на год ці нават на два. Ад тэхнікі многае залежыць. Асабліва калі яна сучасная. Скажам, на трактар паставілі спецыяльную «падрульку», дзякуючы якой сеялка правільна трымае каляю — з дапамогай штучнага спадарожніка Зямлі. І калі радок заходзіць на іншы, то аднаведны сашнік аўтаматычна адключаецца. Гэта ўжо сістэма дакладнага земляробства ў дзеянні. Зараз ставім «падрульку» на «Кейс». Дзякуючы такім сучасным аграпрыёмам даводзім рэнтабельнасць да 48 працэнтаў. Дарэчы, рэнтабельнасць малака 93,7 працэнта. Значыць, кожны ўкладзены рубель дае найвышэйшую аддачу.

Плюс два новыя эканомныя кормараздатчыкі набылі ў дадатак да чатырох наяўных. Эканомных таму, што дзякуючы спецыяльным фрэзам дапамагаюць вытрымліваць рацыён. А яшчэ тры новыя «Беларусы», і ў «сямейку» да іх — МТЗ-30, а гэта сапраўдны айчынны волат, як і камбайн КВК 8060 — апошні ўзор гомельскіх камбайнабудаўнікоў. Вельмі добры памочнік «Джон Дзіру». Раскідвальнікі арганікі. Калі я пачынаў, на полі стаяў адзін бурцік арганікі, сто тон. Зараз уносім сто пяцьдзясят тысяч тон. Вось адкуль ураджай бульбы ў 384 цэнтнеры з гектара. І гэта на суглінках. Хто ведае, той ацэніць.

Набылі легкавыя машыны галоўным спецыялістам. Так што ідзе машынізацыя, а на чарзе аўтаматызацыя вытворчых працэсаў.

— Але вы ўкладваеце і вялікія рэсурсы ў развіццё жывёлагадоўлі.

— Менавіта так. Усе фермы ў нас у бетоне. На ферму можна прыйсці ў туфліках і не запэцкаць ногі. Увялі свабодна-выгульнае ўтрыманне статка. Паставілі сучаснае абсталяванне. У нас тры сучасныя комплексы, і на кожным высокапрадукцыйная ўстаноўка «Вестфалія». Самых надзейных даяркі перавучылі для работы на аператараў гэтых установак і на асемянатараў, прызначылі загадчыкамі фермаў. Правялі навучанне механізатараў, як карміць жывёлу. У выніку вытрымліваецца тэхналогія даення і догляду жывёлы. А жывёлу мы не закуплялі, вырасцілі свой статак. І зараз вырошчваем цёлачак для наступнай, чацвёртай фермы. З яе пускам, які плануем на наступны год, у вёсцы Юлісіно, і выйдзем на 60 тон малака ў суткі.

Зараз займаемся рэканструкцыяй магазіна-сталовай. А самая важкая задума — вярнуцца да ўзвядзення жылля, патрэба ў гэтым ёсць. Магчыма, пакуль самым даступным спосабам — шляхам рэканструкцыі дамоў, якія вызваліліся па розных прычынах. А ў далейшым будзем будаваць новае жыллё. Галоўнае, каб было для каго. Пры такой зарплаце людзі вяртаюцца.

Тым больш што і школа свая, праўда, з'явілася тэндэнцыя да змяншэння колькасці вучняў. Але ёсць база росту для яе — дзіцячы садок, у ім тры групы, 35 малышоў. Вырастуць — пойдуць у школу. Бальніца сястрынская догляду за людзьмі саліднага ўзросту. Акрамя таго, доктар вядзе прыём усіх мясцовых жыхароў.

Эфектыўна гаспадарыць на зямлі нам дапамагае і Беларуская чыгунка. Усяго адзін прыклад: летась яны выдзелілі нам 350 тысяч рублёў на ўгнаенні. Калі мы вялі актыўнае будаўніцтва фермаў, таксама абапіраліся на іх дапамогу. Заўсёды падстаўляюць плячо, за што шчыры дзякуй.

Загадчыца МТФ «Рачкавічы» Аксана ЦАДЗІК : «У такіх поліэтыленавых упакоўках змяшчаецца па сто тон свежага плюшчанага зерня — важнага кампанента корму дойнага статка».

Кацярына ЦІТОВА і Алена ЯЎТУШЭНКА — даяркі абсталяванай па-сучаснаму малочнатаварнай фермы «Рачкавічы».

Галоўны аграном Аляксандр КАСАЧ з дапамогай мабільнага абсталявання вызначае кіслотнасць і тэмпературу глебы.

Перадавыя механізатары Вячаслаў ЯЎСЮК і яго сын Сяргей.

Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ,
Алена ДАЎЖАНОК,
фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 600043393

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 20 ноября 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 30 % (лот № 1), на 40 % (лоты №№ 2, 3, 4, 5), на 20 % (лоты №№ 6, 7) в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Продавца (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). Информация о земельном участке: лот №№ 6, 7 расположены на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9		
1	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34611, площадью 2 759,7 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **изолированное помещение № 7**. Местонахождение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-7	**234 360,00**	11 718,00
2	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34613**, площадью **2 974,2 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **изолированное помещение № 9**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-9	**252 720,00**	12 636,00
3	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34614**, площадью **3 122,6 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **изолированное помещение № 10**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-10	**262 080,00**	13 104,00
4	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34622**, площадью **9 151,1 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 14**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-14	**673 920,00**	33 696,00
5	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34623**, площадью **35 167,2 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 15**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-15	**1 526 400,00**	76 320,00
6	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14327**, общей площадью **647,1** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на пять транспортных единиц с диспетчерской** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпично-панельное здание гаража на пять транспортных единиц с пристроенной двухэтажной кирпичной диспетчерской)	**90 048,00**	4 502,40
7	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14328**, общей площадью **692,4** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц)	**87 264,00**	4 363,20

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8** (044) 797-88-07 – главный инженер Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 10 ноября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 18 ноября 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно сроков договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» лоты №№ 1, 4, 5 от 07.02.2020 г. № 25 (29139); лот № 2 от 28.05.2020 № 102 (29216); лот № 3 от 23.09.2020 г. № 185 (29299); лоты №№ 6, 7 от 29.07.2020 г. № 145 (29259).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

О реализации имущества ЗАО «ЭЛЕКТРОСЕРВИССТРОЙ»

Торги по реализации имущества ЗАО «ЭЛЕКТРОСЕРВИССТРОЙ», назначенные на 12.10.2020, по лотам № 1 – № 4 признаны несостоявшимися

Организатор торгов	**Антикризисный управляющий ИП Марук Людмила Антоновна**
Продавец	**ЗАО «ЭЛЕКТРОСЕРВИССТРОЙ», УНП 101170717**
Форма, дата, время и место проведения торгов	**Первые повторные публичные торги в форме открытого аукциона 25.11.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 700**
Сведения о предмете проведения торгов	Лот № 1: трансформаторная подстанция «Северная» секц. 1, распред. моноблок Safering CCCV; Лот № 2: трансформаторная подстанция «Северная» секц. 2, распред. моноблок Safering CCCV; Лот № 3: трансформаторная подстанция «Энергоблок» секц. 1, распред. моноблок Safering CCCV; Лот № 4: трансформаторная подстанция «Энергоблок» секц. 2, распред. моноблок Safering CCCV. По вопросу ознакомления с предметом торгов, сведений, местонахождения и дополнительной информации по предмету торгов обращаться по тел.: 8044 7945248, 8017 2040494
Начальная цена предмета торгов (без НДС)	Лот № 1: – 13 797,00 руб., лот № 2: – 13 797,00 руб., лот № 3: – 13 871,70 руб., лот № 4: – 13 871,70 руб.
Порядок проведения торгов	Шаг аукциона – 5 %: по лотам №№ 1, 2: – 689,85 руб., по лотам №№ 3, 4: – 693,59 руб. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %
Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка:	задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется по выбранному лоту в срок по 24.11.2020 на р/с BY69 PJCB 2134 0118 8800 4000 0933 в ОАО «Приорбанк» г. Минск, БИК PJCBBY2X, получатель – ЗАО «ЭЛЕКТРОСЕРВИССТРОЙ», УНП 101170717, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах, за каждый лот. Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ИП Марук Л. А. (220134, г. Минск, а/я 73) либо по e-mail: maruk-73@mail.ru до 17.00 24.11.2020. Сроком поступления заявки является дата регистрации в журнале регистрации
Возмещение затрат:	победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня проведения
Для участия в торгах необходимы док-ты	Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах
Ранее опубликованные извещения	Газета «Звязда» – 09.09.2020. – № 175 (29289). – стр. 14, единый государственный реестр сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by

УНП 300039150

24 ноября 2020 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров по адресу: аг. Черейщина, ул. Центральная, 7 (здание сельского дома культуры, 1-й этаж).

Повестка дня собрания:

1) Об итогах работы ОАО «Черейщина» за 9 месяцев 2020 года

2) О продаже акций, находящихся в коммунальной собственности Лепельского райисполкома, в размере 57 % уставного фонда ОАО «Черейщина» в установленном законодательством порядке.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45. При себе иметь паспорт.

Утерянный ЗАО «СК «Белросстрах» бланк страхового полиса «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» формы 2РН, 2РП серии БИ № 0077090 **считать недействительным**.

УНП 100782388

ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества коммунального производственного дочернего унитарного предприятия «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

Лот	Наименование	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона без НДС, бел. руб.
1	1. Административно-бытовой корпус, инв. № 630/С-46875, 1112,3 кв. м; 2. Покрытие асфальтобетонное, 31 кв. м; 3. Внутриплощадочные сети водопровода, инв. № 630/С-79804, 251,5 м; 4. Сети водопровода, инв. № 630/С-79803, 213,3 м; 5. Навес	103 896,50	10389,65	5194,83
2	1. Гараж, инв. № 630/С-46873, 158,7 кв. м; 2. Пристройка к гаражу, инв. № 1589; 3. Покрытие бетонное, 11,0 кв. м	5 068,00	506,80	253,40
3	1. Проходная, инв. № 630/С-75499, 62,2 кв. м; 2. Проектируемая улица а/б, инв. № 830, 739,6 м; 3. Ограждение базы ж/б, инв. № 829	10 440,00	1044,00	522,00
4	1. Одноэтажное кирпичное здание материального склада, инв. № 630/С-50948, 1061,6 кв. м; 2. Электросети территории инв. № 839, 2975,0 м; 3. Нестанд. оборуд. (электротельфер), инв. № 898	30 210,00	3021,00	1510,50
5	1. Двухэтажное кирпичное здание блока мастерских, инв. № 630/С-50951, 2635,1 кв. м; 2. Асфальтовое покрытие, 6760,0 кв. м; 3. Кран-балка, инв. № 863; 4. Нестанд. оборуд. (кран-балка), инв. № 895	110 880,00	11088,00	5544,00
6	1. Повышенный железнодорожный путь. Путь № 1, инв. № 630/С-80255, 727,9 м; 2. Емкость для слива, инв. № 835, 48 куб. м; 3. Емкость для слива, инв. № 836, 48 куб. м; 4. Противопожарный блок (резервуар), инв. № 630/С-80251, 175 куб. м; 5. Противопожарный блок (резервуар), инв. № 630/С-80253, 175 куб. м; 6. Противопожарный блок (резервуар), инв. № 630/С-80135, 135,2 куб. м; 7. Стрелочный перевод, инв. № 834, 29,3 м	118 340,00	11834,00	5917,00
7	1. Железнодорожные пути, инв. № 630/С-79921, 710,9 м; 2. Сушилка, инв. № 630/С-79755, 53,8 кв. м; 3. Рельсовые пути к сушилке, 27,82 м; 4. Вышка	83 178,00	8317,80	4158,90
8	Кран козловой ККК-20М-25-9,5 (макс. груз-ть 17 т), инв. № 859	6 100,00	610,00	305,00
9	Кран козловой (макс. груз-ть 20 т), инв. № 860	4 620,00	462,00	231,00
Лоты расположены по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Сухая, 73				

В отношении вышеуказанного имущества проводятся шестые повторные торги (цена снижена на 80 %). Ранее публикация о проведении аукциона размещалась в газете «Звязда» № 102 (29216) от 28.05.2020 – стр. 14, № 139 (29253) от 21.07.2020 – стр. 14, № 155 (29269) от 12.08.2020 – стр. 10, № 173 (29287) от 05.09.2020 – стр. 5, № 189 (29303) от 29.09.2020 – стр. 10, № 205 (29319) от 21.10.2020 – стр. 14

Обременения в отношении реализуемых лотов: 1. Часть ж/б ограждения базы длиной 217,35 м.п. выходит за границы земельного участка с кадастровым номером 623850100001002237, входит в состав инв. номера 829. Часть ж/б ограждения базы длиной 798,5 м входит в состав капитального строения 630/С-75499 (проходная). 2. Стрелочный перевод расположен на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776, находящийся на праве постоянного пользования у открытого акционерного общества «Передвижная механизированная колонна № 32». Документы на разделение земельного участка и выделение отдельного участка под данный объект, переход прав на земельный участок под объект находятся в стадии оформления. Площадь условного земельного участка под объект составляет 200 кв. м. 3. Административно-бытовой корпус вместе с покрытием асфальтобетонным площадью 31 кв. м находится в залоге у Комитета по труду, занятости и социальной защите Минского областного исполнительного комитета. 4. Одноэтажное кирпичное здание материального склада находится в залоге у ОАО «БПС-Сбербанк». В соответствии со ст. 15 Закона Республики Беларусь от 20.06.2008 № 345-З «Об ипотеке», в случае продажи объекта с публичных торгов залог снимается. 5. Пристройка к гаражу (29 кв. м), нежилые помещения в административно-бытовом здании общей площадью 331,08 кв. м, 21 кв. м, изолированное помещение гаража общей площадью 45 кв. м являются объектом аренды, где ГП «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» является арендодателем.

На стадии реконструкции находятся следующие объекты недвижимого имущества: двухэтажное кирпичное здание блока мастерских, инв. № 630/С-50951, 2635,1 кв. м; асфальтовое покрытие, 6760,0 кв. м; гараж, инв. № 630/С-46873, 158,7 кв. м; пристройка к гаражу, инв. № 1589; покрытие бетонное, 11,0 кв. м

Вышеуказанные лоты расположены на неделимом земельном участке с кадастровым номером 623850100001002237. Площадь – 7,4724 га. Целевое назначение – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности – для содержания и использования базы производственного участка. Право долевой аренды (91/100 доли). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав в отношении недвижимого имущества: находящегося в санитарно-защитных полосах водоводов – охранная зона водопровода , площадь 0,3374 га; находящегося в охранных зонах линий электропередачи – охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 В, площадь 0,0062 га, охранная зона подземных ЛЭП напряжением до 1000 В, площадь 0,3374 га; находящегося в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений – охранная зона тепловых сетей, площадь 0,3374 га; в связи с обслуживанием линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений – охранная зона канализационных коллекторов, площадь 0,3374 га

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА И КРИТЕРИИ ВЫЯВЛЕНИЯ ПОБЕДИТЕЛЯ

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Аукцион проводится до наиболее высокой цены предмета аукциона. Аукционист объявляет участника, предложившего более высокую цену за предмет аукциона, трижды повторяет последнюю цену и при отсутствии надбавок объявляет о том, что имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Данный участник получает статус «Претендент на покупку» и на него распространяются правила и условия, установленные законодательством для победителя аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов, складывающейся в ходе торгов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Начало приема заявлений в 10.00 10.11.2020 г.
Окончание приема заявлений в 16.00 20.11.2020 г.
по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Аукцион состоится 23.11.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by/info/. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества КУП «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.». **Срок внесения задатка: с 10.00 10.11.2020 г. по 16.00 20.11.2020 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Малиновский Юрий Михайлович +375 29 605 53 42.

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», Указа Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)».

При реализации НДС не начисляется на основании подп. 2.30.2 ст.115 Налогового кодекса Республики Беларусь (Особенная часть) от 29.12.2009 № 71-З.

Государственная регистрация договора купли-продажи осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

Организатор аукциона	**ООО «Фрондера»:** **г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1121 ☎ 8 (029) 308 28 97** **• e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by**
Продавец	**Коммунальное производственное дочернее унитарное предприятие «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» в лице антикризисного управляющего ООО «ПрофДМ» ☎ 8 (017) 395-81-34, 8 (017) 395-89-17, 8 (029) 392-89-06**

Асобы

Святло фатаграфічнай памяці

Блізкія і родныя вялікага беларускага пісьменніка выдалі «Фоталетапіс з хатняга архіва Яна Скрыгана»

У нас не часта, а сёння — і зусім рэдка прыходзяць да чытача кнігі мемарыяльнага характару. Раней традыцыяй было выдаваць калектыўныя кнігі ўспамінаў пра пісьменнікаў. Пра Янку Купалу, Якуба Коласа пабачылі свет, дзякуй богу, па некалькі зборнікаў. Так, ёсць спроба распавесці пра лёсы праз серыю «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Праўда, пэўнай сістэмнасці ў гэтым праекце, які і неабходны, і надзвычай важны, няма. Ды не толькі самі па сабе кніжныя выдавецтвы вінаватыя ў адсутнасці высокай кніжнай культуры ў дачыненні да мемарыялізацыі памяці тых, хто яшчэ нядаўна быў побач з намі, чые творы былі запатрабаваныя шырокай чытацкай аўдыторыяй...



Таму вельмі ўразіла нешматслоўнае выданне «Кнігазбора» — «Фоталетапіс з хатняга архіва Яна Скрыгана». У падзагалоўку: «Шляхі, час, сустрэчы, імгненні гісторыі, старонкі жыцця ў рэтраспектыўным аглядзе. XX стагоддзе». Так, пэўна, і павінна быць. Усё ж такі перад намі — альбом фотаздымкаў ды іншых ілюстрацыйных матэрыялаў.

Ян Скрыган прыйшоў у беларускую літаратуру ў бурапенныя 1920-я гады. Дзіўна, што нешта наогул захавалася з фотаздымкаў таго часу. У 1936 годзе, ужо маючы за плячыма творчы і жыццёвы вопыт, выдадзеныя кнігі, маючы сваё месца ў маладой беларускай літаратуры, Ян Скрыган быў арыштаваны. І наступныя амаль два дзесяцігоддзі складае яго гулагаўская біяграфія. Зразумела, без здымкаў. Хіба што адна картка пэўным чынам нагадвае пра яе: «У Маскоўскім заапарку. Па даросе з Сухабудзіма (Краснаярскі край) на радзіму ў Беларусь пасля рэабілітацыі транзітам праз Маскву. Пасля 19 гадоў разлукі! Сядзіць: Ян Скрыган. 20.05.1955, Масква». Пісьменнік, уважлівы да захавання архіва, дакладна падпісваў здымкі. У кароткіх тэкстоўках — характэрныя тлумачэнні, якія робяць здымкі сапраўднай гісторыяй. Цікавым падаецца наступны каментарый дачкі Яна Скрыгана — Галіны Іванаўны Скрыган, якая ўклала кнігу, зрабіла ўсё магчымае, каб альбом пабачыў свет: «...Бацька стараўся даць максімальны каментарый да кожнай асобы, месца і часу дзеяння. Мне прыгадваюцца эпізоды з маёй маладосці, больш за 50 гадоў таму, калі тата каторы раз намагаўся ўспомніць імёны сваіх паплечнікаў-маладнякоўцаў — кожнага з сямідзесяці! Як ён дбаў, каб ніводнае прозвішча не канула ў нябыт. І як пакутаваў, калі пераконваўся, што памяць не змагла ўтрымаць некаторыя з іх! Але большая частка імёнаў, на вялікае шчасце, была ім адноўлена. І вось, застылыя ў часе, на нас глядзяць зусім юныя дзяўчаты і хлопцы, якіх мы можам назваць і якія былі каля вытокаў станаўлення беларускай савецкай літаратуры. А некаторым з іх наканавана было стаць сапраўднымі майстрамі прыгожага пісьменства. Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка, Міхась Лынькоў, Паўлюк Трус, Яўгенія Пфляўмбаўм, Алесь Дудар, Міхась Чарот...»



Вярнуўшыся да актыўнага літаратурнага жыцця, увогуле да жыцця — чыстага, светлага, канешне ж, са сваімі праблемамі, але без вокрыкаў лагернай аховы, без іншых выдаткаў знаходжання ў месцах зняволення, Ян Скрыган шмат падарожнічаў, шмат сустракаўся з чытачамі. Глядзіш на некаторыя здымкі — і здзіўляешся, як яму было ўсё цікава. Гэта відаць не толькі па вачах, пільным позірку, але і па самой кампазіцыі фотаздымкаў. Колькі ў гэтых, зробленых у Таджыкістане, Украіне, Латвіі, Маскве, Нарыльску, фотакартках усмешак, радасці, святла!.. А колькі ў яго было сяброў, добрых таварышаў! Дарэчы ў альбоме — і рэпрадукцыі захаваных пісьменнікам запрашэнняў на вечарыны, святочныя імпрэзы з нагоды юбілеяў калег-літаратараў Васіля Віткі, Кандрата Крапівы, Максіма Танка, Алеся Асіпенкі, Міколы Аўрамчыка...

Фотаздымкі, іншыя ілюстрацыйныя матэрыялы (у тым ліку і факсіміле аўтографаў, адрасаваных Яну Скрыгану) дапаўняюць «Думкі з запісных кніжак», гісторыка-літаратурныя матэрыялы, звязаныя з жыццём, творчасцю легендарнага майстра беларускай прозы. Сярод іх — і адказы на анкету аднаго з нашых «звяздоўскіх» выданняў («Чырвоная змена», 22 чэрвеня 1980 года). Было ў той анкеце і пытанне: «Якія творы маладых беларускіх пісьменнікаў апошняга часу вы лічыце найбольш удалымі і чаму?» Вось што адказаў Ян Скрыган: «...скажу пра тое, што мяне радуе ці абнадзейвае. Здаецца, залетась у «ЛіМе» прачытаў апавяданне незнаёмай аўтаркі. Спадабалася рэдкае цяпер імя — Хрысціна, затрымала ўвагу і прозвішча — Лялько... <...> З таго часу я зацікаўлена чакаю: калі ж Хрысціна Лялько зноў пакажацца ў друку? Бо з такою моваю грэшна маўчаць. <...> І яшчэ адзін чалавек запомніўся: Святлана Алексіевіч сваім апавяданнем «Цётка Стэфа». Я маю прывычку ўсё чытаць з алоўкам у руках і, прызнаюся, усё яе апавяданне скрэсліў найбольш добрымі пametамі. За спробу паказаць душэўны рух вобраза».

Вось і ўся фатаграфічная кніга, прысвечаная Яну Скрыгану, паказвае «душэўны рух» асобы цікавага, адметнага беларускага пісьменніка, які і творчасцю сваёй, і лёсам, шчырым служэннем Радзіме, варты таго, каб яго помнілі.

Кастусь ХАДЫКА.

Лабірынтамі мастацтва

«КАРУНКІ ЖЫЦЦЯ» ВОЛЬГІ ПАЎЛЕНКІ

Вясковая настаўніца сваімі посцілкамі пераўзышла еўрапейскі авангард

Сёння гераіняй майго артыкула будзе матуля мастачкі Марыі Ісаёнак — Вольга Елісееўна Паўленка. У мінулым годзе споўнілася 100 гадоў з дня яе нараджэння. Столькі яна, вядома, не пражыла, памерла ў 89 гадоў у Мінску ў сям'і дачкі. Творчасцю займалася апошнія дзевяць гадоў жыцця — так склалася, што да сталых гадоў не было часу і магчымасці ў поўнай меры праявіць свой мастацкі талент.

Вольга Елісееўна вязала абрусы. Каля 70 — цэлая калекцыя. Шкада, не дажыла да сваёй выстаўкі, якую зладзіла мастацтвазнаўца Таццяна Гаранская ў галерэі «Добрыя думкі». Яна першая прызнала яе творы мастацкімі.

Вольга Паўленка нарадзілася ў вёсцы Вялікае Бабіна Віцебскай вобласці 15 студзеня 1919 года. Скончыла педагагічнае вучылішча ў Мінску і ўсё жыццё працавала настаўніцай пачатковых класаў. Да вайны — у Зембіне. Калі пачалася вайна, бацька на кані завёз яе дадому ў вёску. Па даросе выкінуў усе педагагічныя кніжкі, якія яна забрала з сабой. Сказаў: «Забудзь, што ты настаўніца, бо цябе немцы застрэляць».

У вайну захварэла на двухбаковае запаленне лёгкіх, ляжала ў бальніцы пад гарой кажухоў, якія змог прывезці бацька. Тую частку бальніцы, дзе лячылі мясцовае насельніцтва, немцы не чапалі. Вазіў сала і самагон доктару-немцу, каб той хоць бы крыху яе лячыў... А калі забраў дамоў, Вольга не магла стаяць на нагах: яе калаціла ліхаманка. Але, пэўна, наканавана было жыць. Маладосць узяла сваё.

Калі скончылася вайна, Вольгу ўжо з двума малымі дзецьмі адправілі ў Гарадок Віцебскай вобласці, а адтуль у вёску Кісялі, што ў 20 кіламетрах ад Гарадка. Вёска стаяла ў надзвычай прыгожым месцы на беразе возера. Школы ў Кісялях не было, і настаўніцы даводзілася хадзіць у Янава праз лес на работу. Зімы былі на Віцебшчыне надта снежныя. Уставаць мусіла рана. Сын Коля ў вайну захварэў на грып, што прывяло яго да інваліднасці. Калі вырашылі пабудаваць у Кісялях пачатковую школку, настаўніцы даводзілася быць прарабам, кіраваць будаўніцтвам. Затое школа — насупраць новай хаты, якую пабудаваў яе муж наўзамен хаткі з земляной падлогай. Стала нават дырэктарам гэтай школкі.

Жыццё сельскай настаўніцы было нялёгкае: уся гаспадарка, і школа, і дзеткі на ёй. Муж працаваў трактарыстам усё лета ў полі, а зімой рамантаваў тэхніку ў раёне. Па ваду трэба было хадзіць да возера, несці вёдры ў гару. Зімой была неабходнасць расчышчаць палонку. А яшчэ — напаліць у печы, дагледзець скаціну, накарміць траіх дзетак. У той час у дэкрэтны водпуск маглі ісці толькі на тры месяцы, і малодшую дачку, 11-месячную Любачку, прыходзілася браць з сабою ў школу — неўзабаве дзіця прастыла і памерла. Але ніколі, нягледзячы на работу дома, Вольга не дазваляла сабе не падрыхтавацца да ўрокаў, сядзела да ночы, правярала сшыткі пры лямпе-газоўцы, пісала планы ўрокаў.

З дзяцінства адчувала цягу да прыгажосці, любіла маляваць крэйдай, прутком на пяску.... Убачыла ў часопісе карціну літоўскага мастака Чурлёніса і перамалявала. У хаце заўсёды стаялі прыгожыя букеты палявых кветак. Любіла вырошчваць усякую ўсячыну. Вышукавала ў часопісах і выпісвала па пошце дзівосныя расліны. Лета было радасцю: разам з дзецьмі хадзілі ў маліны, у грыбы. Сонейка, вада ў азёрах, сунічкі, стагі сена, узгоркі...

І зараз, гледзячы на ўзоры на посцілках, настольніках ды пакрывалах, бачыш у іх усе радасці і нягоды жыцця сельскай жанчыны. Святло і цені, чорнае і белае, чырвонае і блакітнае, жоўтае... Дзіўна, як можна спалучыць у адным абрусе столькі колераў! Гэтаму навучыць немагчыма. Гэта можна толькі ўвабраць у сябе ад прыроды. І гэта — Віцебшчына, паўночны край.

Плесці свае карункі «тамбуркай» Вольга Елісееўна пачала, калі пераехала да дачкі ў Мінск, у 80 гадоў, каб не сумаваць без справы. Прасіла купіць рознакаляровыя ніткі і радавалася ім, як мастак фарбам. І так яе гэта захапіла, што дня не хапала на здзяйсненне задум, даводзілася дзецям-мастакам прымушаць яе класціся спаць. Яна ніколі не сумавала дома: пляла свае карункі, наладжвала ў кватэры «выстаўкі», разлажыўшы, развесіўшы свае вырабы на сталах, падлозе, сценах, і чакала, калі прыйдуць з майстэрні дачка ды зяць, мастак Мікола Ісаёнак. І ён будзе цешыцца і пляскаць у ладкі, прыгаворваючы: «А-яй, як жа прыгожа». І назвы сваім творам давала паэтычныя, у якіх адчуваюцца захапленне жыццём і радасць творчасці: «Напякла я аладкі», «Сонейка заходзіць», «Лунная саната».

Дачка Марыя, мастачка-каларыстка, заўсёды здзіўлялася яе народнаму чуццю колеру і гармоніі. Калі Вольга Елісееўна пляла з нітак многа маленькіх квадрацікаў ці кружочкаў, здавалася, настолькі гэта страката, што немагчыма аб'яднаць у адно цэлае. І вось усё сабрана ў абрус, і вось яна, гармонія. Фантастычным чынам майстрыха злучыла ў сваёй творчасці два пачаткі: дакладную геаметрыю і яркі каларыт. Гульня з маштабам здзіўляе, гульня формаў зачароўвае. Адчуваецца такая ўнутраная смеласць і абсалютнае прыродное пачуццё рытму, мернасці — ладу, што думаеш: гэта ж сучасныя абстрактныя карціны ў тэкстылі! Калі б мы зараз побач павесілі постары шэдэўраў еўрапейскага авангарду, то невядома, што перамагло б па дынаміцы, унутранай гармоніі і адначасова дзёрзкасці. Цікава яшчэ, што ў абрусах ёсць цесная сувязь з традыцыйнымі «выкладанымі» посцілкамі і дываномі Віцебшчыны ў тэхніцы пераборнага ткацтва. Вольга Елісееўна, несумненна, бачыла іх у сялянскіх хатах. Што гэта, як не абуджаная генетычная памяць? Разам з тым яна адлюстравала і свае асабістыя думкі і пачуцці, сваё жыццё, свой настрой.



Пляла свае карункі да апошніх дзён і адышла ў іншы свет ціха і спакойна. Простая, бездакорная, сціплая беларусачка, як і сотні іншых. Але пакінула пасля сабе цэлы скарб. Ён заўсёды натхняе дачку: яна напісала шмат твораў з матчынымі абрусамі, а цяпер вырашыла выдаць альбом з яе творамі.

Надзея УСАВА, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.

Рыштаванні Бацькаўшчыны

Спадчына без спадчыннікаў,

альбо Што рабіць з закінутымі сінагогамі

Калі аб'екты спадчыны разбураюцца, мала клапаціцца толькі пра кансервацыю і аднаўленне, важна падумаць пра мясцовыя супольнасці, якім такія будынкі могуць паслужыць. Уласна, менавіта з людзей, якія жывуць побач, і пачынаецца вяртанне. Руіны ці пабудовы, што рассыпаюцца, перастаюць быць кучай камянёў, калі людзі даведваюцца, якая гісторыя стаіць за кожным помнікам. А самае дзіўнае пачынаецца, калі будынкі абрастаюць новымі падзеямі і ідэямі, ператвараюцца ў культурную прастору, здольную мяняць усіх, хто туды прыходзіць.

Сёлета Беларускі камітэт Міжнароднага Савета па помніках і гістарычных мясцінах (ІКАМОС) і прадстаўнікі мясцовых супольнасцяў з розных куткоў нашай краіны распачалі маштабны праект «Захаванне і актуалізацыя былых сінагог у Беларусі», у межах якога праводзяцца адукацыйныя семінары, шэраг разнастайных культурных мерапрыемстваў, вывучаецца вопыт па рабоце з падобнымі аб'ектамі ў іншых краінах. А галоўнае, назапашваюцца ідэі, як надалей працаваць з любой спадчынай. Усё ж сёння вельмі многа аб'ектаў патрабуюць увагі. Важна прасачыць, як розныя традыцыі ўзаемадзейнічалі, аказвалі ўплыў на мясцовае жыццё і як нашы аб'екты ўпісваюцца ў сусветную культурную скарбонку.

БЕЗЛІЧ ПЫТАННЯЎ

Пытанне, што рабіць з закінутымі сінагогамі, — адно з самых балючых: гэта спадчына без спадчыннікаў. У гады Другой сусветнай вайны ў многіх гарадах і мястэчках яўрэйскае насельніцтва было вынішчана. Разам з носьбітамі культуры і традыцый часта знікала і частка мясцовай гісторыі. Нельга забываць, што ў многіх гарадах і мястэчках яўрэі да вайны складалі 30-50 працэнтаў насельніцтва.

Старшыня праўлення Беларускага камітэта ІКАМОС Сцяпан Стурэйка, акрэсліваў праблему, якую неабходна паспрабаваць вырашыць у межах новага праекта па захаванні спадчыны («Сінагогі: паміж забыццём і прыняццем»): «Калі мы гаворым пра сінагогі, найперш згадваем самае відавочнае — будынкі, але гэта толькі вяршыня айсберга. Нельга забывацца пра культуру і яе сляды, у тым ліку нематэрыяльныя, часам яны не ўспрымаюцца як свае, як тыя, у якія трэба інвеставаць маральныя і матэрыяльныя рэсурсы».

Часта такія аб'екты стаяць у цэнтрах паселішчаў, але сёння яны не лічацца важнымі. Напрыклад, да «Дажынак», Дзён пісьменства, іншых мерапрыемстваў рэстаўраваліся цэрквы і касцёлы, замкі і сядзібы, гістарычныя будынкі, часам і шараговая забудова. А ці ўкладваліся сродкі ў сінагогі? І гэта пры тым, што многія з іх з'яўляюцца шыкоўнымі помнікамі архітэктуры. Хіба што можна згадаць пра кансервацыю сінагогі ў Быхаве — будынка, створанага яшчэ ў XVII стагоддзі.

Ці многа вы знойдзеце даследаванняў, прысвечаных яўрэйскай архітэктурнай спадчыне? А колькі будынкаў знікала на нашых вачах і пры гэтым не фіксавалася, як яны выглядалі. Напрыклад, у Лоеве сінагога была разабраная ўжо ў XXI стагоддзі і пры гэтым да нас дайшло вельмі мала яе выяў.

Па падліках Цэнтра яўрэйскага мастацтва Яўрэйскага ўніверсітэта Іерусаліма, які ў 2018 годзе выдаў даведнік па сінагогах Беларусі, у нашай краіне захавалася каля 120 аб'ектаў. Большасць з іх знаходзіцца ў здавальняючым стане і працягвае існаваць, праўда, вельмі рэдка як рэлігійныя будынкі. Часцей у іх размешчаныя кінатэатры, дамы культуры, склады, аўтамайстэрні і нават райаддзелы міліцыі. Другая палова будынкаў альбо дажывае апошнія дні як аб'екты камунальнай гаспадаркі з высокай ступенню зносу, або пабудовы ўжо закінутыя ці нават у стане руін.

Сёння ў Беларусі ў розных гарадах дзякуючы намаганням мясцовых ініцыятыў выпрацоўваюцца новыя канцэпцыі развіцця будынкаў сінагог.

Сярод пакінутай часам яўрэйскай спадчыны ёсць і сапраўдныя архітэктурныя жамчужыны, напрыклад сінагогі ў Ружанах, Ашмянах. Некаторыя важныя гістарычна — як сінагога ў Віцебску, у якой малілася сям'я Шагала. З больш чым 120 аб'ектаў у спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў патрапіла толькі каля двух дзясяткаў будынкаў.

Для большасці гэтых аб'ектаў адзіная надзея на выратаванне — аказацца патрэбнымі бізнесу ці мясцовым жыхарам.

Застаецца безліч пытанняў. Ці трэба ўсе гэтыя аб'екты уключаць у дзяржаўны ахоўны спіс? Як вызначыцца, што трэба ўратаваць абавязкова і для чаго? Напрыклад, ці трэба захоўваць будынкі, якія не ўяўляюць архітэктурнай каштоўнасці? Хто павінен браць адказнасць за іх? Ці можна гэту адказнасць падзяляць у тым ліку з яўрэямі, якія пакінулі межы Беларусі, з'яўляюцца грамадзянамі іншых дзяржаў, але не забываюцца пра малую радзіму і гатовы ўкладаць грошы ў захаванне памяці? Як дапамагчы мясцовым жыхарам, якія выступаюць за захаванне такіх аб'ектаў? Якім чынам будуць аднаўляцца будынкі і якія функцыі яны будуць выконваць? Так, калі ў іх рабіць музеі, ці будуць яны рэнтабельныя і запатрабаваныя ў невялікіх населеных пунктах? І зноў жа, як упісаць новыя формы работы, каб гэта не выглядала дзікунствам, не крыўдзіла людзей, для якіх сінагога — рэлігійны аб'ект? Нагогул, як пры вырашэнні лёсу будынкаў улічыць інтарэсы ўсіх (у тым ліку пажаданні яўрэяў) і запусціць рэнтабельныя праекты, дзякуючы якім спадчына будзе аднаўляцца і захоўвацца?

Важна знаёміцца і з вопытам работы з такой спадчынай у іншых краінах. Так, у Польшчы падобныя аб'екты могуць мець статус ахоўваемых помнікаў, быць адрэстаўрыраванымі з захаваннем усіх нормаў, але пры гэтым у будынках з адноўленымі роспісамі, нанесеных на розныя турыстычныя карты, можа размяшчацца... звычайная прадуктовая крама ці нават бар. У Літве сінагогі становяцца мультыкультурнымі пляцоўкамі, на іх базе расказваюць пра Халакост і гісторыю яўрэяў, пра каштоўнасць чалавечага жыцця, гуманізм, правы чалавека. Тут можна гаварыць пра ўзаемаўплыў розных культур, паказваць фільмы, праводзіць выстаўкі і прэзентацыі, даваць магчымасць для сустрэч і навучання самых розных катэгорый, знойдуцца мерапрыемствы і для дзяцей, і для людзей старэйшага ўзросту.

САЦЫЯЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

За кожным архітэктурным аб'ектам стаіць і культурная спадчына. У наш час трэба не толькі рэанімаваць забытыя веды, сэнсы, здабыткі, але і генерыраваць новыя ідэі.

Сёння ў Беларусі ў розных гарадах дзякуючы намаганням мясцовых ініцыятыў выпрацоўваюцца новыя канцэпцыі развіцця будынкаў сінагог, вядзецца даследаванне па гісторыі сінагог у пасляваенныя гады, калі яны перасталі служыць рэлігійнымі аб'ектамі, бо нават такія пошукі могуць выявіць цікавыя факты.

Часам само жыццё падказвае, у якім кірунку рухацца. У мястэчках захоўлёўваць бетонную сцяну на беразе Дняпра, каб стварыць выяву жыцця, што тут было ў мінулым стагоддзі, прыйшлі да ідэі напісаць песні, якія тут раней гучалі. Адна з песень была на ідыш. Таксама тут па матывах яўрэйскіх аўтараў мясцовыя жыхары рабілі спектакль. У музеі «Бітвы за Дняпро» згадваюць не толькі пра ваенную трагедыю яўрэйскай абшчыны Лоеўскага раёна, у экспазіцыі можна пабачыць экспанат — байкі Крылова, перакладзеныя ў 1920-я гады на ідыш.

Актывісты з Гродна клапоцяцца не толькі пра захаванне будынка сінагогі, але і пра напаўненне яе зместам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сярод пакінутай часам яўрэйскай спадчыны ёсць і сапраўдныя архітэктурныя жамчужыны, напрыклад сінагогі ў Ружанах, Ашмянах. Некаторыя важныя гістарычна — як сінагога ў Віцебску, у якой малілася сям'я Шагала.

ваецца памяць пра тое, што, здавалася б, вынішчана і сцёрта вайной. Усплываюць імёны вядомых месцічаў-яўрэяў, мы даведваемся пра тое, які ўнёсак яны зрабілі ў культуру і навуку. Рэшткі яўрэйскіх пабудоў упісваюцца экскурсаводамі ў новыя маршруты.

Эксперт Беларускага камітэта ІКАМОС Ганна Альбертаўна Выгонная заўважае, што падчас рэалізацыі разнастайных культурных праектаў у малых гарадах ёй міжволі даводзіцца сутыкацца з яўрэйскай культурай, якую таксама трэба перажываць і трансліраваць.

Здавалася б, у сучасным Лоеве мала што можа нагадваць пра гісторыю яўрэйскага мястэчка, але, калі ў гарадскім пасёлку пачалі размаваць на нас. Натуральна, такая памяць будзе вельмі карысная пры распрацоўцы праектаў, якія стануць рэалізоўваць у адноўленых аб'ектах спадчыны.

НОУ-ХАЎ

«Шматвекавое шчыльнае суседства народаў, змяшэнне культур таксама можа быць нацыянальным брэндам», — упэўнена Мая Кацнэльсон, заснавальніца Цэнтра беларуска-яўрэйскай культурнай спадчыны. Асноўная задача гэтай грамадскай арганізацыі — вывучэнне і трансляцыя ведаў аб тым, якая яўрэйская культура існавала на нашых землях, як яна ўплывала на беларускую культуру і наадварот. Актывісты стараюцца прыцягваць да сваіх праектаў у тым ліку і выхадцаў з Беларусі. Яны працавалі, у прыватнасці, са спадчыннікамі Лазара Хідэкеля — аднаго з заснавальнікаў легендарнага аб'яднання «УНОВИС» Віцебскай мастацкай школы. На жаль, сёння імя гэтага яскравага прадстаўніка авангарда і першага ў свеце супрэматычнага архітэктара ў Беларусі амаль забытае.

Супрацоўнічае аб'яднанне і з праўнучкай мастака і архітэктара Эль Лісіцкага — сёлета быў рэалізаваны праект па стварэнні на аснове адной з яго работ формы для футбольнага клуба «Віцебск». Дарэчы, падобных праектаў у свеце яшчэ не было. Як заўважыла Мая Кацнэльсон, сёння важна развіваць новыя формы і ўяўленні, ганарыцца здабыткамі, зробленымі на нашай зямлі, паказваць, што ў жыхароў Беларусі глыбокі культурны код.

Сінагогі маглі б стаць месцамі для эксперыментаў і праўнучкай новых формаў работы ў тым ліку па вяртанні гонару за адкрыцці і дасягненні, зробленыя на нашай зямлі.

Актывісты з Гродна таксама клапоцяцца не толькі пра захаванне будынка сінагогі, але і пра напаўненне яе зместам. Нават музычныя фестывалі, выстаўкі карцін могуць працаваць на прадухіленне антысеміцкіх настрояў, на выхаванне культурнага чалавека, які здольны ўспрымаць свет у яго разнастайнасці. Аб'екты спадчыны могуць станавіцца не толькі музеямі ці якімі іншымі культурнымі ўстановамі, але і цэнтрамі нефармальнай адукацыі, месцамі, адкуль людзі будуць выходзіць з новымі ведамі, ідэямі, думкамі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ЧАМУ ДАЧКА БАБРУЙСКАГА СТАРАСТЫ РАЗВЯЛАСЯ З ЛОЎЧЫМ ЛІТОЎСКІМ

Кранальныя гісторыі кахання... Колькі разоў яны былі падставай для напісання літаратурных сюжэтаў, палотнаў і п'ес... Прычым нярэдка ў рэальнасці гісторыя аказваецца зусім не такая ўжо кранальная, а часам проста брыдкая.
18 верасня 1743 года ў Рэчы Паспалітай адбыўся скандал: вялікі лоўчы літоўскі Міхал Антоній Сапега развёўся з жонкай, Кацярынай Людвікай з Сапегаў.
Ды не проста развёўся — шлюб быў прызнаны несапраўдным. Прычына — блізкае сваяцтва сужэнцаў, а на такі шлюб імі ў свой час не было атрымана благаславенне ад вышэйшых царкоўных улад.
Шлюб паміж сваякамі ў магнацкіх сем'ях, на які патрэбны адмысловы дазвол, — справа не выключная. Гэтак Багуслаў Радзівіл загарэўся ажаніцца са сваёй падапечнай, багатай сіратой, стрыечнай пляменніцай Марыяй — хоць быў кальвіністам, грошай адваліў Папе Рымскаму нямерана.
У фантастычную суму ў два мільёны злотых абышоўся шлюб са стрыечнай сястрой Тэафіляй Дамініку Радзівілу.
А што ж Сапегі пасквапнічалі?

СЯСТРА ФАВАРЫТА

Давайце перанясёмся ў самы пачатак гэтай гісторыі, 29 чэрвеня 1733 года. Пятнаццацігадовая Кацярына Людвіка, дачка бабруйскага старасты Яна Сапегі, выходзіць замуж за свайго стрыечнага брата Міхала Антонія, якому дваццаць два гады. Ці магло быць паміж маладымі людзьмі каханне, якое змусіла забыць пра асцярогу?

На партрэтах Міхал Антоній выглядае вельмі прывабна: круглы мяккі твар, цёмныя разумныя вочы... Вядома, што ён валодаў куртуазнай навукай, быў цалкам свецкім чалавекам. Вучыўся ў Кёнігсбергу. Пісаў вершы, перакладаў Вальтэра.

Ян Сапега.

А Людвіка тры гады таму асірацела — памёр яе бацька, Ян Сапега, староста бабруйскі, вялікі гетман літоўскі. Той самы інтрыган, які перабег у Расію і, па водгуках іспанскага пасла герцага Лірыя-Бярвіка, выглядаў наступным чынам: «Толькі адна была ў яго добрая якасць, што быў ён вельмі адважны. Тры разы бунтаваў ён супраць свайго караля, і таму змушаны быў з'ехаць у Расію, дзе з-за ўплыву пры дварэ сына яго, улюбёнца імператрыцы Кацярыны I, узвялі яго ў фельдмаршалы. Ён не ведаў нават самых першых асноў вайсковага майстэрства, не меў ані кроплі розуму, быў звяглівы, уладны, напіваўся штодзённа, быў ілгун і здольны ўсё ўчыніць дзеля дасягнення сваёй мэты».

Дзеля гэтай мэты — улада і багацце — Ян Сапега спачатку сватаў свайго сына Пятра Паўла да малодшай дачкі ўсясільнага фаварыта Пятра I Меншыкава. Але пасля смерці цара і пападання Меншыкава ў нямілась заручыны былі без усялякіх сантыментаў скасаванья, і Пётр зрабіўся фаварытам... імператрыцы-ўдавы. Кацярына, як вядома, была з беларускага роду Скаўронскіх, яе бацька працаваў садоўнікам у Сапегаў, у іх маёнтку, які знаходзіўся ў Мінску, дзе зараз Кастрычніцкая плошча.

Каб спыніць плёткі, царыца ажаніла юнага каханка са сваёй пляменніцай, Соф'яй Скаўронскай. Калі Кацярына памерла, Пётр зразумеў — трэба ўцякаць. І вярнуўся на Радзіму разам з неверагоднымі сваімі багаццямі. Каб далей удзельнічаць у інтрыгах: кароль Аўгуст Моцны памёр, пачалася эпоха бескаралеўя. На трон прэтэндавалі сын памерлага манарха Аўгуст і Станіслаў Ляшчынскі, на апошняга паставілі Сапегі. Ім належала аднавіць моц роду: толькі што прайгралі сапраўдную вайну, калі магнаты Рэчы Паспалітай аб'ядналіся супраць занадта магутнага клана.

Пётр Павел Сапега і ўзначаліў цяпер сям'ю і стаў апекуном малодшай сястры. Так што вельмі падобна, што шлюб паміж Людвікай і Міхалам Антоніем проста ўмацоўваў палітычны саюз: Міхал таксама збіраўся ўвайсці ў партыю Станіслава Ляшчынскага. Пятнаццацігадовая дзяўчынка стала звычайным інструментам у палітычных інтрыгах. І тут было не да рэлігійных тонкасцяў. Тое, што шлюб не абставілі як след, пасля некаторыя гісторыкі расцэньвалі як зададзенасць: маўляў, ці адзін бок, ці другі меркаваў выкарыстаць гэта.

НАРАДЖЭННЕ Ў ВЯЗНІЦЫ

Час для Міхала Антонія быў надзвычай бурлівы. У тым жа 1733 годзе ён спрабуе атрымаць званне палкоўніка Ваўкавыскага павета, але дарэмна. Магчыма, новы кароль Станіслаў Ляшчынскі адорыць сваіх прыхільнікаў?

Ляшчынскі, які, дарэчы, ужо другі раз спрабаваў замацавацца на троне Рэчы Паспалітай, спадзяваўся на дапамогу Францыі, бо ягоная дачка стала жонкай французскага караля. Але ягоны сапернік, сын памерлага Аўгуста II, меў падтрымку Расіі — 20-тысячнае войска рушыла апошняму на дапамогу.

12 верасня 1733 года Станіслаў Ляшчынскі, пераапрануты ў гандляра, змог дабрацца праз Германію да Кракава і на выбарчым сойме быў абвешчаны каралём. Але з'явілася расійскае войска, і няўдалы манарх уцёк. А 5 кастрычніка ўжо быў каранаваны Аўгуст III.

А для маладой пары, Людвікі і Міхала Сапегаў, пачаўся жах. Асабліва, вядома, для юнай жонкі. Міхала Антонія як прыхільніка Ляшчынскага арыштавалі расіяне і перавезлі ў Рыгу. З мужам была і Кацярына Людвіка.

Маладажоны знаходзіліся пад арыштам. У якіх умовах, невядома, апрача аднаго: Кацярына была цяжарная. Там, у палоне, яна нарадзіла дачку. Польскі гісторык Войцэх Крэгсайсен піша пра тую дзяўчынку толькі адно: «Лёс невядомы».

Можаце сабе ўявіць гэта! Шаснаццацігадовая маці, уцягнутая ў палітычныя інтрыгі братам і мужам — стрыечным братам, сядзіць у вязніцы, страчвае дзіця....

У жніўні 1734 года расійская царыца Ганна Іванаўна паабяцала Міхалу Антонію Сапегу вызваленне, калі за яго паручыцца вялікі гетман Міхал Вішнявецкі.

ПАЛЯВАННЕ ЗА ПАСАГАМ

Што ж, мяняць партыі для магнатаў было справай звыклай. Міхал Антоній выходзіць на волю. У 1736-м Ляшчынскі канчаткова адрокся ад прастола, і Міхал Антоній на пару са шваграм Пятром пачалі ўдзел у палітычных інтрыгах. Міхал нарэшце з вялікай цяжкасцю атрымлівае званне вялікага лоўчага літоўскага... Змагаецца і за спадчыну роду. Напрыклад, каб надворны падскарбі Юзаф Францішак Сапега даў за сваёй дачкой Тэрэзай, якая збіралася замуж за Геранімa Радзівіла, толькі пасаг, а астатнія ўладанні завяшчаў яму, Міхалу Антонію, і яго брату Юзафу — няма чаго аддаваць маёмасць Сапегаў ворагам-Радзівілам.

Міхал Антоні Сапега.

Кацярына Людвіка, мяркуючы па ўсім, не магла забыцца пра перажытае. Пра тое, як абышліся з ёю абодва браты. Яна таксама не была рахманая авечка. Дастаткова зірнуць на яе партрэт сталага ўзросту: сапраўдная амазонка! Яна стане адной з арганізатарак Барскай канфедэрацыі, будзе змагацца з братам Пятром за палітычны ўплыў... Судзілася з братам і за маёнткі, якія дасталіся яму ад маці. Пётр быў гулец, шмат прайграваў, вечна знаходзіўся ў пазыках. Ды яшчэ быў такі жорсткі, што сяляне ў ягоных уладаннях бунтавалі. У свой час захацеў правярнуць палітычную махінацыю: дамаўляўся даставіць са Швецыі 10 тысяч жаўнераў у падтрымку Станіслава Ляшчынскага, але толькі вялізныя сумы прыліплі да ягоных пальцаў. Давялося суіснаваць з Чартарыйскімі і каралём Аўгустам III. Для таго выдаў Аўгусту змову прускага рэзідэнта ў Варшаве, за што атрымаў месца ваяводы смаленскага. І тут жа таемна прапанаваў французскаму прынцу Францыі Луі дэ Канці ўключыцца ў барацьбу за польскую карону... І атрымліваў ад французаў за ўяўнае спрыянне па тысячы дукатаў у год.

Бедная Кацярына Людвіка... Вядома, што на фоне гэтых інтрыг у яе нарадзілася яшчэ адно дзіця ад Міхала Антонія. Брат Міхала, Юзаф Станіслаў Сапега, запісаў пра гэта ў сваім дзённіку. Маленькі Ян нарадзіўся ў 1735-м і памёр у 1737-м.

ПІРОГ НЕ ПА ЗУБАХ

У 1742-м пачынаецца справа аб разводзе... Хто яе пачаў? Улічым, што Міхал Антоній, яшчэ не атрымаўшы пацвярджэння аб скасаванні шлюбу, пасватаўся да Тэрэзы, дачкі Юзафа Францішка Сапегі, якая тады ж развялася з Геранімам Радзівілам. Недарэмна ў свой час гэтак перажываў за ейную маёмасць...

Князь Геранім увайшоў у гісторыю як акрутны тыран, што задушыў Крычаўскае паўстанне. У п'есе Уладзіміра Караткевіча «Маці Урагану» гераіня гэтак праклінае князя: «Вось што будзе з табой. Адна жонка, з Сапегаў, ужо ўцякла ад цябе. Жанчыны любяць тыранаў, але толькі не скупых, не халодных і не нудных, як свіная чума. Уцячэ і другая. І трэцяя. І ўсе — з вялікаю ганьбай для цябе, напладзіўшы табе сотні ворагаў... І ні ад адной бабы ў цябе не будзе дзяцей, бо Бог праклятае чэрава кожнай жанчыны на час, калі яна з табой».

Тэрэза Сапега была першай жонкай князя Гераніма, уладальніка Слуцкага замка, і сапраўды ўцякла ад яго — з дапамогай прыдворнага доктара Бахстрома, які пашкадаваў зняволеную юную прыгажуню. Але стаць жонкай Міхала Антонія адмовілася.

Міхал абраў іншую выгадную нявесту. На гэты раз пайшоў па-банку: пасватаўся да Тэклі Радзівіл, удавы вялікага гетмана літоўскага Міхала Вішнявецкага. Гэта той самы Вішнявецкі, які вызваліў з палону ў Рызе Міхала Сапегу і яго юную жонку. Тэкля была старэйшая за Міхала на восем гадоў, затое невымерна багатая — да ўласнай спадчыны далучаліся ўладанні двух мужоў-нябожчыкаў.

З гэтым шлюбам Міхал пралічыўся: і Сапегі засталіся незадаволеныя, і Радзівілы, якія самі прэтэндавалі на згаданыя багацці, і Чартарыйскія, і Вішнявецкія... Смачны пірог усім здаваўся занадта вялікім для аднаго нахабніка, тым больш што Тэкля памерла праз два гады пасля шлюбу, усё пакінуўшы ўдаўцу. Нават брат Юзаф адвярнуўся ад Міхала, пабаяўшыся, што той надта моцна ўзнясецца. Чартарыйскія перасталі падтрымліваць Міхала Антонія... Ён пасля загладзіць сваю віну тым, што ажэніцца з маладзейшай на 19 гадоў Аляксандрай Чартарыйскай. Рэзідэнцыя пані Аляксандры была ў замку ў Высокім, але ў 1748-м там усчаўся пажар. І сужэнцы пераехалі жыць у Слонім, атрыманы ў спадчыну Міхалам ад Тэклі Радзівіл. Вось і пачалі Міхал і Аляксандра ператвараць гэты горад у сядзібу муз, што давершыць наступны муж пані Аляксандры, Міхал Казімір Агінскі. Бо Міхал Антоній, апантаны збіральнік багацця, так і памёр бяздзетны.

БЕДНЫ, АЛЕ КАХАНЫ

А Кацярына Людвіка не стала абіраць багатага ды ўплывовага мужа, хоць магла. «Наелася», відаць, дынастычных здзелак. Замест шлюбу па разліку ў 1745-м яна выйшла за прыдворнага Сапегаў, Альберта Паўла Жыўну.

Мяркуючы па ўсім, той Жыўна быў не роўны Кацярыне. Больш за тое — ён, здаецца, і шляхціцам не з'яўляўся, а гэта ўжо зусім мезальянс. Што пацвярджае факт: Жыўна атрымаў шляхецкую годнасць пасля вяселля ад імператрыцы Марыі Тэрэзы, па адных звестках — у 1756 годзе, па другіх — у 1745-м. Шляхецтва было падорана яму разам з прыдомкам фон Ліліенгоф, так называўся маёнтак Кацярыны Сапегі ў Сілезіі. Ясна — адбылося тое пры пратэкцыі Кацярыны Людвікі. Яна ж сама да канца жыцця называла сябе Сапегай, а пакольскі шляхцянкі дадавалі сабе званне мужа, выкарыстоўвала пасаду першага мужа — вялікага лоўчага. З Жыўнам Кацярына мела дваіх сыноў, якія працягнулі род. І наколькі ў гэтым шлюбе спраўдзіліся мары пятнаццацігадовай дзяўчынкі, якая выходзіла замуж у эпоху бескаралеўя, хто ведае?

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

РУП «Торговый дом «Восточный»

извещает о проведении 10.12.2020 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 602/С-13806 общей площадью 158,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Руденский с/с, д. Анетово, ул. Цветочная, 20А. Назначение: здание специализированное розничной торговли; наименование: магазин. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624475700101000390 площадью 0,0719 га. **Начальная цена продажи – 33 534,00 бел. рубля, задаток – 3 353,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Незарегистрированное капитальное строение общей площадью 22,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, 1А/36, блок 10, ГСПК «Рудник-шлам». **Начальная цена продажи – 1 458,00 бел. рубля, задаток – 145,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-46492 общей площадью 288,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. III Интернационала, д. 199. Назначение: административно-бытовое здание; наименование: административно-бытовое здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 640400000001000321 площадью 2,9314 га. **Начальная цена продажи – 94 575,60 бел. рубля, задаток – 9 457,56 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. 51/100 доли капитального строения с инвентарным номером 632/С-10324 общей площадью 105,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, г. Воложин, ул. Казинца, 1. Назначение: здание блокированного жилого дома; наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622050100075000003 площадью 0,1183 га. **Начальная цена продажи – 12 474,00 бел. рубля, задаток – 1 247,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Капитальное строение с инвентарным номером 602/С-14050 общей площадью жилых помещений 35,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Дубровский с/с, д. Бытень. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом (составные части и принадлежности: бревенчатый жилой дом с сенями, верандой и тремя сараями, уборной, колодцем). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624487000601000002 (присвоен предварительно). **Начальная цена продажи – 2 610,00 бел. рубля, задаток – 261,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Земельный участок с кадастровым номером 623280810601000030 площадью 0,2394 га, расположенный по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, д. Родевичи, уч. № 4. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома. **Начальная цена продажи 4 730,40 бел. рубля, задаток – 473,04 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Земельный участок с кадастровым номером 623280810601000027 площадью 0,2431 га, расположенный по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, д. Родевичи, уч. № 3. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома. **Начальная цена продажи – 4 795,20 бел. рубля, задаток – 479,52 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Единый объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 330/С-16038 общей площадью 113,2 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Портовая, 1Б/1. Назначение: здание специализированное водного транспорта; наименование: склад стройгруппы. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 323550100010000786 площадью 0,3401 га. **Начальная цена продажи – 20 844,00 бел. рубля, задаток – 2 084,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Земельный участок с кадастровым номером 622283900014000093 площадью 0,0987 га, расположенный по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Станьковский с/с, СТ «Ракета», 33. Целевое назначение: ведение коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 3 061,80 бел. рубля, задаток – 306,18 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Земельный участок с кадастровым номером 622283900014000092 площадью 0,0976 га, расположенный по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Станьковский с/с, СТ «Ракета», 35. Целевое назначение: ведение коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 3 017,70 бел. рубля, задаток – 301,77 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Земельный участок с кадастровым номером 624484000005000096 площадью 0,0595 га, расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Новопольский с/с, садоводческое товарищество «Родничок-Птичь», 7. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 512,00 бел. рубля, задаток – 151,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 12. Изолированное помещение с инвентарным номером 610/D-10646 общей площадью 7,1 кв. м расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 39, пом. 36. Назначение: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13, наименование: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13. **Начальная цена продажи – 5 281,44 бел. рубля, задаток – 528,14 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Изолированное помещение с инвентарным номером 440/D-3191 общей площадью 23,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Ошмянский р-н, г. Ошмяны, ул. Пионерская, д. 29, корп. 3, пом. 24. Назначение: помещение транспортного назначения; наименование: гараж кирпичный. **Начальная цена продажи – 648,00 бел. рубля, задаток – 64,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-11461 общей площадью 11,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрь, ул. Колхозная, 54. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625083009101000170 площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 2 160,00 бел. руб, задаток – 216,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 15. Земельный участок с кадастровым номером 623883000043000051 площадью 0,1020 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Олехновичский с/с, СТ «Ветеран-7», У-68. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 5 500,00 бел. рубля, задаток – 550,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 16. Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-62197 общей площадью 784,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. III Интернационала, д. 199, корп. 7. Назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); наименование: сварочный цех. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 640400000001000321 площадью 2,9314 га. **Начальная цена продажи – 155 520,00 бел. рубля, задаток – 15 552,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 17. Капитальное строение с инвентарным номером 451/С-13800 общей площадью 429,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. Дятлово, ул. Советская, д. 102В. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад зав. производства. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422350100002001185 площадью 0,0568 га. **Начальная цена продажи – 43 650,00 бел. рубля, задаток – 4 365,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 18. Земельный участок с кадастровым номером 321880402101000026 площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Верхнеолбянский с/с, д. Нижняя Олба, ул. Ленина, 6А. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома (размещения объектов усадебной застройки). **Начальная цена продажи – 1 059,12 бел. рубля, задаток – 105,91 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

Аукцион состоится 10.12.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.

